

ТАТА ВАМ НЕ МАМА

9

ЧЫМ ПАРТЫЗАНЫ ДАПАМАГАЛІ НАСЕЛЬНІЦТВУ

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 САКАВІКА 2020 г. АЎТОРАК № 52 (29166)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЦІШЧАНКА, прэс-сакратар канцэрна «Белнафтахім»:**

*«Мы ўсё робім для таго, каб можна было выкарыстаць момант, атрымаць выгадную сыравіну. Рынак мы кантралюем, вывучаем і працуем з усімі магчымымі пастаўшчыкамі. Ён цяпер дынамічна мяняецца. Расце колькасць прапаноў, цэны падаюць. Працаваць трэба з усімі, назіраем, таму што на сёння буйных здзелак па новых цэнах яшчэ не зафіксавана».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Каб не пацярпелі ні людзі, ні эканоміка»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў сітуацыю вакол гучных заяў расійскага боку аб закрыцці граніцы з дзяржаўным сакратаром Савета бяспекі Андрэем Раўковым і кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Ігарам Сергеенкам.**

Заяву аб намеры закрыць граніцу з Беларуссю агучыў учора прэм'ер-міністр Расіі Міхаіл Мішусцін.

«Не тое што нас вельмі ўжо хвалюе і ў нас тут ледзь не паніка, не. Але тэма вартая таго, каб падумаць, як нам дзейнічаць адпаведна і адэкватна. Дзіўна, што ў расійскім урадзе ніхто не ведае, што ў нас граніцы няма. Яна не дэлімітавана і не дэмаркіравана. У нас няма граніцы, таму закрываць няма чаго», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён зрабіў здагадку, што расійскі бок усталяваў граніцу ў сябе. Здзіўляе менавіта «закрыццё» — не ўвядзенне кантролю хворых на каранавірус ці нейкія іншыя мерапрыемствы. У адказ Прэзідэнт асобным «гарачым галовам» можа толькі параіць думаць, перш чым казаць. «Справа ў тым, што закрыць — як і пачаць нейкую вайну, яшчэ штосьці — заўсёды прасцей, чым потым з гэтай сітуацыі выходзіць. Таму што пасля закрыцця прыйдзе перыяд, калі трэба будзе адкрываць. А я ведаю, як гэта. Гэта ўсё вельмі няпроста. Я асабіста не жадаў бы, каб гэта ў маім жыцці паўтарылася», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2




Фота БелТА.

# Лясны сейбіт

Вясной не толькі збожжа сеюць, але і дрэвы садзяць. На тэрыторыі Брэсцкага лясгаса, напрыклад, плануюць высадзіць каля 1,4 мільёна дрэў на тэрыторыі прыблізна 240 гектараў. Самыя вялікія плошчы для пасадкі знаходзяцца ў падпарадкаванні Пелішчанскага лясніцтва. Асаблівы акцэнт лесаводы зробяць на аднаўленні тэрыторый, распрацаваных пасля высечкі паваленых ветрам дрэў і масавага ўсыхання ад пашкоджання караедам.



Фота БелТА.

Майстар лесу Пелішчанскага лясніцтва Ян МІЦКЕВІЧ садзіць маладыя хвойкі.

## КОРАТКА

- **МАРГ правядзе расследаванне ў дачыненні да сеткі жорсткіх дыскаўнтараў «Святлафор».**
- Рэальныя грашовыя даходы беларусаў у студзені выраслі на 6,8 %.
- **У беларускіх ВНУ ўносяцца змены ў навучальны працэс.**
- Жыллё, якое будуецца ў Беларусі, пачалі прадаваць праз інтэрнэт.
- **У месцах пазбаўлення волі часова адмянілі спатканні з наведвальнікамі.**
- «Белавія» прыпыняе рэйсы ў Кішынёў, Рыгу, Баку і Бейрут.



- **Міжнародны велафестываль плануюць правесці ў Іванаўскім раёне.**
- Амністыя да 75-годдзя Перамогі можа кранунць 1,8 тысячы асуджаных за наркотыкі.

Падаткі

# КРАЙНІ ТЭРМІН — 31 САКАВІКА

## Але некалькі тысяч чалавек усё-такі пра гэта «забудуць»

**Да першага красавіка нашым людзям трэба паспець падаць падатковыя дэкларацыі аб даходах за мінулы год. Гэта трэба рабіць у тым выпадку, калі вы атрымлівалі такія даходы, падаткі за якія не выплачваліся на працягу года. Пра падрабязнасці сёлетняй падатковай кампаніі расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Міхаіл РАСОЛЬКА.**

### Траціна ўжо спіць спакойна

Па выніках першай дэкады сакавіка беларусы падалі ў падатковыя органы 11 783 дэкларацыі. Больш за ўсё (прыкладна 4,2 тысячы) падалі дэкларацый у Мінску, на другім месцы сталічны рэгіён — 1,8 тысячы, 1,7 тысячы — у Гомельскай, 1,2 тысячы — у Брэсцкай, прыкладна па 1 тысячы — у Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях.

Што характэрна, сёлета 63 % пададзеных дэкларацый (амаль 7,5 тысячы) былі накіраваны ў інспекцыю ў электронным выглядзе. Такая магчымасць з'явілася яшчэ ў 2018 годзе, але актыўна ёю карыстацца пачалі менавіта цяпер — летась было толькі 23 % электронных дэкларацый. І ўсё ж такі частка грамадзян, асабліва старэйшага ўзросту, скарыстаецца традыцыйным спосабам падачы дэкларацый: асабіста ў інспекцыі або па пошце.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# «Каб не пацярпелі ні людзі, ні эканоміка»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Расія закрыла граніцу ў якасці меры барацьбы з новым каранавірусам. Але, на думку Прэзідэнта, вірусолагі разумеюць, што змагацца з вірусам тэрытарыяльна немагчыма, асабліва ў нашым глабалізаваным свеце. Больш за тое, па логіцы Расіі граніцы ў ёй самой трэба закрываць ужо рэгіянальна, працягнуў Аляксандр Лукашэнка. «Расія велізарная, паўсвету. Навошта ж адрэзалі Беларусь ад Расіі, не падумаўшы пра наступствы? Мне здаецца, там больш заклапочаныя тым, як Маскву нейкім плотам агарадзіць і думаць: крый божа, урад заразіцца. І пачалі здалёк», — іранічна заўважыў беларускі лідар.

Ён упэўнены: з вірусамі трэба змагацца па сутнасці, прафесійна, кропкава. Прэзідэнт выказаў здзіўленне тым, што расійскі бок бясплатна прапанаваў Беларусі тры тысячы тэстаў. У Міністэрстве аховы здароўя такой дабрачыннасці нават не зразумелі. А ўсходняя суседка растлумачыла: для абароны на граніцы з Польшчай.

«Сапраўды, мы гэта робім (кантроль тых, хто ўязджае. — **«Зв.»**) ужо два месяцы амаль, як толькі сігнал пайшоў. На ўсіх граніцах, акрамя Расіі, правяраем людзей. Вось яны нас праспансіравалі, прызналі, што мы гэта робім правільна», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка. На агульнай заходняй граніцы і трэба было зрабіць акцэнт замест таго, каб закрываць мяжу з Беларуссю, упэўнены лідар краіны. Калі Расія сама прызнала сваю сітуацыю складанай, лагічна было б ад нашай краіны чакаць боязі, што вірус прывязуць адтуль.

«Вы ж чаго баіцеся Беларусі? Гэта ж не той велізарны мядзведзь! Пры такім нашым кантролі і стаўленні да гэтай праблемы — давайце разам гэта рабіць. Не. Закрылі. Ну што ж, іх справа. Мы мусім сёння вызначыцца, што нам рабіць у гэтай сітуацыі, каб не пацярпелі ні людзі, ні эканоміка: за год 110 мільёнаў тон грузу перамясцілася транзітам! Чым думалі людзі, калі прымалі такія рашэнні?» — не разумее Прэзідэнт.

Ён прадбачыць велізарныя чэргі фур, незадаволенасць людзей, нязручнасць для беларусаў у Расіі і расіян у Беларусі... Аляксандр Лукашэнка плануе па тэлефоне абмеркаваць праблему з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Падыход адзін: людзі пацярпець не павінны. Адпаведны комплекс мер лідар краіны даручыў выпрацаваць разам з урадам.

**Варвара МАРОЗАВА.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Не трэба ніякай панікі, трэба проста працаваць»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў новых міністра сельскай гаспадаркі і харчавання, пасла ў Малдову, памочніка-інспектара на Магілёўшчыну, узгадніў прызначэнне 19 кіраўнікоў мясцовай улады і шэраг іншых дзяржслужачых высокага звяна.**

## Ад сельскай гаспадаркі да медыцыны

Сельскую гаспадарку ўзначаліў Іван Крупко, які дагэтуль кіраваў Мінскім райвыканкамам. Папярэдні міністр Анатоль Хацько вызвалены ад пасады ў сувязі з пераходам на іншую работу. Прэзідэнт падкрэсліў, што «страціць» яго нельга. «У яго прафесія добрая. Я вам ужо казаў, у нас якраз у жывёлагадоўлі праблем хапае. Даць работу, каб сур'ёзна папрацаваў, — ён можа працаваць. Патрэбны больш дасведчаны чалавек у плане кіраўніка. Мяркую, што досвед таварыша Крупко якраз дазволіць надаць большую дынаміку ў сельскай гаспадарцы. Прынамсі, я на гэта спадзяюся», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён папярэдзіў, што спакойна працаваць на новай пасадзе не атрымаецца, яна патрабуе няспынных «варушэнняў». Досвед, атрыманы ў самым няпростым раёне краіны, Мінскім, гэтаму паспрыяе, спадзяецца Прэзідэнт.

Прадстаўляць нашу краіну ў якасці Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ў Малдове накіраваны Анатоль Калінін, у 2010—2018 гадах намеснік прэм'ер-міністра Беларусі. «З Малдовай у нас цудоўныя адносіны. Там не проста нармальны чалавек прэзідэнт, гэта вельмі вялікі сябар Беларусі, вы з ім заўсёды адшукаеце агульную мову. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва — у аснове. Што да палітыкі і іншых пытанняў, у нас там праблем няма, ды і з эканомікай няблага», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Памочнікам Прэзідэнта Беларусі — інспектарам па Магілёўскай вобласці назначаны Аляксандр Субоцін. Са жніўня 2018-га да першага лютага 2020 года ён займаў пасаду члена калегіі (міністра) па прамысловасці і аграпрамысловым комплексе Еўразійскай эканамічнай камісіі. Аляксандру Субоціну Прэзідэнт пажадаў больш пахадзіць па зямлі і добра ўнікнуць у працэсы сельскагаспадарчай вытворчасці.

«Вось з кіраўніком Адміністрацыі папрацуеце, Магілёўскую вобласць падымеце, адпаведнае і стаўленне будзе», — абазначыў задачу Аляксандр Лукашэнка.

На пасаду генеральнага дырэктара ВГРУП «Белмедтэхніка» назначаны галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Дзмітрый Страздзін. Аляксандр Лукашэнка чарговы раз звярнуў увагу на цэнаўтварэнне лекаў і медыцынскай тэхнікі, якія краіна закупляе. Гэта пытанне нумар адзін.

## Кірунак — на поле

Адміністрацыя Прэзідэнта разгледзела і падрыхтавала для ўзгаднення 19 кандыдатаў на пасады кіраўнікоў мясцовых органаў улады, уключаных у кадравы рэестр кіраўніка дзяржавы.

Большасць новых кіраўнікоў будзе працаваць у раёнах. Таму першы пункт парадку дня — пасяўная, якая ўжо пачалася. «У сувязі з тым, што неардынарная была зіма — неблагая была зіма, дай бог, каб сакавік пражылі спакойна, без моцных маразоў. І той, хто разгорнецца, будзе з ураджаем. Усе практычна вобласці, дзе больш, дзе менш, пачалі пасяўную кампанію ранніх збожжавых культур, перш за ўсё. Глебу трэба рыхтаваць, разумна рыхтаваць — не трэба па балотах лазіць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Ну і выклікаў вельмі шмат. Вы бачыце: ***свет з глузду з'ехаў ад каранавіруса ці, мабыць, на падставе гэтых усіх разважанняў пра каранавірус. Але для нас не гэта галоўнае і страшнае. Мы раней вірусы перажывалі, перажывём і гэты. Мы адэкватна рэагуем і вельмі даўно рэагуем — кропкава»,*** — чарговы раз запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго перакананні, ***сёння самая вялікая адказнасць — эканоміка, на якой таксама рэзка адлюстраваўся ўздым захворвання.*** Закране актуальная праблема і нованазначаных службовых асоб: менавіта ім давядзецца на месцах працаваць з людзьмі. У прыклад кіраўнік дзяржавы прывёў павышаны попыт, якім некалькі дзён таму карысталіся медыцынскія маскі. Прадпрыемствы лёгкай прамысловасці былі пераарыентаваныя на іх вытворчасць, нашылі зашмат — і цяпер няма куды іх дзяваць. Дайшло да спрэчак з сістэмай аховы здароўя, якой столькі і не патрэбна, абмаляваў сітуацыю кіраўнік дзяржавы. «Праўда, я сказаў, што трэба разгортвацца: у Германіі не хапае спецадзення, масак. Трэба прадаць ім, калі ёсць попыт. Мне пастаянна дакладвае міністр аховы здароўя, што ў нас, у Беларусі, эпідэміялагічная сітуацыя пакуль — пакуль — лепшая, чым у іншыя, звычайныя, «непраблемныя» гады», — разважае Аляксандр Лукашэнка.

Лідар дзяржавы падкрэсліў: ***«Не трэба ніякай панікі, трэба проста працаваць. Асабліва цяпер, на вёсцы»,*** дадаўшы: «Таму глядзіце за эканомікай і глядзіце за людзьмі. Не трэба думаць, што людзі ў нас дрэнныя. Людзі такія, як мы. Ці мы такія, як нашы людзі. Іншых не будзе. Такія яны ёсць, з імі трэба працаваць. І я скажу, што ***не самыя дрэнныя ў нас людзі — разумныя, талковыя, з адэкватнай рэакцыяй на сітуацыю».***

***Прэзідэнт нагадаў, што тэхналагічную і працоўную дысцыпліну ніхто не адмяняў.*** Гэта самыя важныя элементы ў любой эканоміцы — і планавай, і рыначнай, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Ён перасцярог ад небяспекі «зайграцца» з рынкам у спадзяванні, што той усё «адрэгулюе». Такі падыход тоіць магчымасць упусціць сітуацыю.

«І не забывайце — палітычны год. Мы здаём экзамены. Не толькі я. Я ў першую чаргу. Але і вы таксама. Без вас ніякага экзамену ніхто не здасць, і мне будзе вельмі складана. Я жадаю вам поспехаў», — звярнуўся да чыноўнікаў Аляксандр Лукашэнка.

## Ратацыя ў рэгіёнах

Намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама назначаны Дзмітрый Гарадзецкі, які дагэтуль быў начальнікам галоўнага фінансавага ўпраўлення выканкама. Першым намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама — старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні выканкама Сяргей Ляўковіч, намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама — старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве выканкама Аляксандр Кручанаў.

Намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама назначаны кіраўнік адміністрацыі Савецкага раёна Мінска Юрый Трушчанка, старшынёй Баранавіцкага райвыканкама — першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Баранавіцкага райвыканкама Міхаіл Палуян, старшынёй Маларыцкага райвыканкама — старшыня камітэта эканомікі Брэсцкага аблвыканкама Міхаіл Бацэнка.

Старшынёй Бешанковіцкага райвыканкама стала старшыня Глыбоцкага раённага Савета дэпутатаў Галіна Унуковіч, Докшыцкага райвыканкама — начальнік Полацкага філіяла Віцебскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры Алег Кавалёнак. Сенненскі райвыканкам узначаліў Ігар Мароз, дагэтуль першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Лепельскага райвыканкама.

Старшынёй Дзятлаўскага райвыканкама стаў дырэктар ААТ «Прынёманскі» Навагрудскага раёна Андрэй Садоўскі, старшынёй Свіслацкага райвыканкама — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі, старшынёй Мінскага райвыканкама — першы намеснік старшыні Уладзімір Юргевіч.

Смалявіцкі райвыканкам узначаліў дырэктар ААТ «Новае жыццё» Нясвіжскага раёна Андрэй Ратамскі, Бабруйскі райвыканкам — першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Кіраўскага райвыканкама Аляксандр Сухадольскі, Краснапольскі райвыканкам — начальнік аддзела землеўпарадкавання Клімавіцкага райвыканкама Аляксандр Трушкін.

Старшынёй Хоцімскага райвыканкама стаў першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Шклоўскага райвыканкама Міхаіл Куксянкоў, Чэрыкаўскага — першы намеснік старшыні Клімавіцкага райвыканкама Аляксандра Міхеенка. Кіраўніком адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска стаў першы намеснік кіраўніка Дзмітрый Шашок, Савецкага раёна — дырэктар КВУП «Мінскрэклама» Сяргей Хільман.

Узгоднены назначэнні на пасаду намесніка міністра аховы здароўя Алены Богдан (дагэтуль узначальвала галоўнае ўпраўленне арганізацыі медыцынскай дапамогі, экспертызы, зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб Міністэрства аховы здароўя), намесніка міністра культуры — Валерыя Грамады (дагэтуль галоўны саветнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі). Кандыдатура першага намесніка старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці Уладзіміра Гадзяцкага ўзгоднена на пасаду старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці.

Начальнік упраўлення КДБ па Гомельскай вобласці Аляксандр Мельнікаў заступіў на пасаду члена Гомельскага аблвыканкама, старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў Аляксандр Шчаковіч — на пасаду члена Мінскага гарвыканкама.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Папа Рымскі памаліўся аб збавенні свету ад пандэміі



Папа Рымскі Францыск пакінуў Ватыкан, каб памаліцца аб збавенні ад пандэміі COVID-19. Ён здзейсніў набажэнства ў дзвюх рымскіх базіліках. Пра гэта паведаміла «Бі-бі-сі». Спачатку пантыфік у неафіцыйнай абстаноўцы ўзнёс малітву перад шырока ўшанаваным у народзе абразом маці Божай Salus Populi Romani («Вырататаванне народа рымскага») у адной з чатырох галоўных цэркваў Рыма — базілікі Санта-Марыя-Маджорэ. Затым пешшу дабраўся да базілікі Сан-Марчэла-аль-Корса, дзе захоўваецца цудатворнае распяцце. Яго ў 1522 годзе выносілі на працэсію па вуліцах Рыма з малітвай аб заканчэнні эпідэміі чумы. «Папа Францыск памаліўся аб заканчэнні пандэміі, якая ўразіла Італію і ўвесь свет, заклікаў да вылячэння шматлікіх хворых, узгадаў ахвяр апошніх дзён і папрасіў, каб іх сям'і і сябры знайшлі суцяшэнне і падбадзёрванне», — адзначыў кіраўнік службы друку Святога прастола Матэа Бруні.

## Прэзідэнт Ізраіля даручыў фарміраванне ўрада Бені Ганцу

Прэзідэнт Ізраіля Рэўвен Рыўлін прыняў рашэнне даручыць фарміраванне кабінета міністраў Бені Ганцу і заклікаў яго зрабіць гэта як мага хутчэй. Раней кандыдатуру кіраўніка цэнтрысцкага блока «Кахоль-Лаван» падтрымалі больш за палову дэпутатаў кнесета — 61 парламентарый, у тым ліку аднапартыйцы Ганца, прадстаўнікі саюза левых «Авода-Гешэр-Мерэц», дэпутаты ад арабскага «Аб'яднанага спіса» і сябры партыі «Наш дом — Ізраіль». Найбольшая колькасць галасоў на выбарах 2 сакавіка была пададзена за партыю «Лікуд» Біньяміна Нетаньяху. Але для фарміравання ўстойлівай кааліцыі атрыманых 33 дэпутацкіх крэслаў, а таксама 16 мандатаў саюзнікаў не хапае. Раней Нетаньяху прапанаваў свайму апаненту стварыць надзвычайны ўрад адзінства на шасцімесячны перыяд.

## Кароль Іспаніі адмовіўся ад спадчыны і пазбавіў бацьку фінансавання

Феліпэ VI прыняў рашэнне пазбавіць свайго бацьку, колішняга кіраўніка дзяржавы Хуана Карласа, сродкаў з бюджэту каралеўскага дома, а таксама адмовіўся ад спадчыны. Такое рашэнне было прынята пасля таго, як швейцарскае выданне Tribune de Genève паведаміла, што пракуратура расследуе паходжанне 65 мільёнаў еўра, якія манарх перадаў сваёй цяпер ужо былой палюбоўніцы. Гэтыя сродкі, па звестках СМІ, — частка грошай, якія былі пераведзены на рахунак у швейцарскім банку ў 2012 годзе прадстаўнікамі акружэння саудаўскага караля «ў якасці падарунка» пасля яго пасярэдніцтва пры заключэнні здзелкі з іспанскімі кампаніямі для будаўніцтва высакахуткаснай чыгункі паміж Меккай і Мядынай.

На слыху

# Дыягназ пацвердзіўся. Клінічных праяў няма

**У Беларусі каранавірус зарэгістраваны ўжо ў 36 пацыентаў. На выхадных атрыманы станоўчыя тэсты ў чацвярых беларусаў, якія прыбылі з Мюнхена, Амстэрдама і Масквы. Таксама аналізы пацвердзілі COVID-19 у пяці студэнтаў БДУ.**

Нагадаем, што папярэдня тэсты ў студэнтаў далі станоўчыя вынікі, паўторныя аналізы дыягназ пацвердзілі. Аднак клінічных праяў у іх няма.

Што датычыцца чатырох грамадзян, якія прыбылі з-за мяжы, то яны шпіталізаваны ў момант вяртання, іх бліжэйшыя кантакты таксама ізаляваны.

Такім чынам, каранавірус зарэгістраваны ў 36 пацыентаў. Трое з іх пасля атрымання адмоўных вынікаў ужо выпісаны са стацыянара, яшчэ трое рыхтуюцца да выпіскі.

— З усіх інфіцыраваных у васьмі чалавек назіраюцца мінімальныя прыкметы інфекцыйнага працэсу, праводзіцца неабходная тэрапія згодна з зацверджанай інструкцыяй, — расказала **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.** — Адзін з пацыентаў знаходзіцца ў стане сярэдняй цяжкасці са станоўчай дынамікай. У астатніх пацыентаў сімптомаў інфекцыйнага працэсу няма.

У міністэрстве паведамілі, што за апошнія суткі выканана даследаванне на каранавірус па 950 узорах біяматэрыялу. Яшчэ каля 200 знаходзіцца ў рабоце. Усяго з пачатку лютага спецыялісты РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі правялі больш за 16 тысяч тэстаў на COVID-19.

— Хацелася б адзначыць, што размяшчэнне замежных студэнтаў з неспрыяльных па каранавірусе краін у кантакт-цэнтры сябе апраўдала. Цяпер у Мінскім абласным цэнтры медыцынскай рэабілітацыі «Загор'е» знаходзіцца 128 чалавек, у аздараўленчым комплексе БДУ «Брыганціна» — 153, вольных месцаў цалкам дастаткова для завяршэння такіх абмежавальных мерапрыемстваў, — падкрэсліла Юлія Барадун.

Па выніках эпідрасследавання, выяўлення носьбітаў, кантактных асоб, іншых мерапрыемстваў санітарна-эпідэміялагічнага нагляду на эпідэміялагічным і медыцынскім кантролі знаходзіцца 2583 чалавекі, ніхто з іх не мае прыкмет інфекцыі.

**Алена КРАВЕЦ.**

### Не каранцін, але абмежаванне кантактаў

**Ва ўсіх установах адукацыі Беларусі ўзмоцнены санітарна-прафілактычныя меры. Пра гэта Міністэрства адукацыі паведаміла ў сваім афіцыйным Telegram-канале. У навучальных установах рэкамендуецца абмежаваць наведванні, адмовіцца ад правядзення масавых мерапрыемстваў і па магчымасці абмежаваць перамяшчэнні ўнутры саміх установ. Пры першых сімптомах прастудных захворванняў неабходна неадкладна паказацца ўрачу.**

У вышэйшых навучальных установах, каб пазбегнуць масавага збору людзей, рэкамендавана адмовіцца ад лекцый і выкарыстоўваць іншыя формы заняткаў, прадугледжаныя вучэбнымі планамі і праграмамі: практыкумы, кансультацыі, лабараторныя работы. Пад асаблівым кантролем будуць знаходзіцца ўсе інтэрнаты — рэкамендавана абмежаваць доступ у іх старонніх асоб, узмацніць супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы.

Будзе абмежавана правядзенне навуковых і культурна-масавых мерапрыемстваў. Разам з тым ва ўсіх установах адукацыі павінен быць арганізаваны нармальны навучальны працэс.

Днём раней у Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе на факультэце міжнародных адносін былі выяўлены студэнты, інфіцыраваныя каранавірусам, было прынята рашэнне перанесці лекцыйныя курсы для ўсіх факультэтаў на пазнейшы тэрмін.

Кіраўніцтва ўніверсітэта просіць студэнтаў і выкладчыкаў уважліва ставіцца да свайго стану здароўя і здароўя навакольных і выконваць усе неабходныя правілы асабістай гігіены і рэкамендацыі Міністэрства аховы здароўя па прафілактыцы распаўсюджвання віруснай інфекцыі.

Міністэрства спорту і турызму таксама рэкамендавала да 6 красавіка адмяніць спартыўныя мерапрыемствы з удзелам дзяцей і падлеткаў і перанесці іх на пазнейшыя тэрміны. Тое ж самае датычыцца і міжнародных спартыўных спаборніцтваў на тэрыторыі Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# Сакавіцкія арэлі

Калі ў сераду на паўднёвым захадзе да плюс 17, то ў нядзелю ў паўночных раёнах ужо да мінус 10

**У нашай краіне на гэтым тыдні вернецца цяпло, але да выхадных зноў пахаладае, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Заўтра будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у асобных раёнах Віцебскай вобласці магчымыя невялікія кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёва-заходні ўмераны. Уначы будзе ад мінус 3 градусаў да плюс 4 градусаў, удзень — 8—15 цяпла, а па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — да плюс 17 градусаў. У чацвер да тэрыторыі Беларусі з Заходняй Еўропы падыдзе слабавыражаны атмасферны фронт, які прынясе шчыльную воблачнасць. Таму ўначы па паўночнай палове, а раніцай і ўдзень па ўсёй краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер заходні ўмераны. Уначы чакаецца ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень — 7—13 цяпла, па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей ад плюс 14 градусаў да плюс 16 градусаў.

Прагназуецца, што ў пачатку трэцяй дэкады сакавіка праз тэрыторыю краіны перамесціцца халодны франтальны падзел. У чацвер ападкаў ён прынясе няшмат, але стане адцісkаць за межы Беларусі цёплае паветра. Будзе воблачна з праясненнямі, месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература ўначы складзе ад 3 градусаў марозу да 4 цяпла, пры праясненнях — да мінус 5 градусаў. Удзень прагназуецца 5—10 цяпла, па паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці на пару градусаў цяплей.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя пад уплывам паветраных мас з поўначы ў нас зноў пахаладае. Ужо ў суботу будзе воблачна з праясненнямі. Месцамі, пераважна ў паўднёвых раёнах краіны, пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночны, паўночна-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 7 градусаў, па поўдні — да плюс 3 градусаў. Удзень будзе ад нуля да 7 цяпла. У нядзелю ўначы будзе 1—8 марозу, а ў паўночных раёнах пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Удзень — да 8 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ДОМА І СЦЕНЫ ДАПАМАГАЮЦЬ

## Міністэрства замежных спраў Беларусі пастаянна трымае ў полі зроку вяртанне дамоў суайчыннікаў

**У шэрагу сумежных з Рэспублікай Беларусь краін уведзены дадатковыя абмежаванні, накіраваныя на прадухіленне распаўсюджвання віруснай інфекцыі COVID-19, у тым ліку забарона на ўезд замежных грамадзян. Учора аб закрыцці граніц аб'явіла Расія. Пазначаныя меры ў сумежных краінах не абмяжоўваюць выезд з іх грамадзян Беларусі.**

З 00 гадзін 01 хвіліны па кіеўскім часе 16 сакавіка 2020 года тэрмінам на два тыдні не ажыццяўляецца пропуск на ўезд праз дзяржаўную граніцу Украіны замежнікаў і асоб без грамадзянства, у тым ліку ў рамках транзітнага праезду.

Літва ўвяла каранцін з поўначы 16 сакавіка: забаронены ўезд на тэрыторыю краіны большасці замежнікаў (за выключэннем грузаперавозчыкаў, членаў сем'яў грамадзян Літвы, асоб, якія маюць дазвол на пражыванне і работу ў Літве, дыпламатаў).

Жыхарам замежных краін, у тым ліку грамадзянам Беларусі, выдзелены «гуманітарны калідор» на працягу трох сутак (з 16 да 18 сакавіка 2020 года ўключна) з магчымасцю перасекчы тэрыторыю Літвы транзітам, каб вярнуцца ў свае дзяржавы. З поўначы 19 сакавіка ўезд на тэрыторыю Літвы будзе забаронены. Міністэрства замежных спраў на афіцыйнай старонцы ў «Фэйсбуку» настойліва рэкамендуе ўсім грамадзянам Беларусі, якія жадаюць вярнуцца ў Беларусь, зрабіць гэта ў тэрмін да 0.00 гадзін 19 сакавіка.

Пасольства звяртаецца з просьбай да грамадзян Беларусі, якія знаходзяцца ў дадзены момант у Літоўскай Рэспубліцы альбо плануюць перасекчы Літву транзітам, загадзя размяркоўваць маршруты руху і паклапаціцца аб своечасовым набыцці білетаў.

МЗС звяртае ўвагу, што авіякампанія «Белавія» пацвердзіла магчымасць браніравання месцаў на рэйсы па маршруце Вільнюс — Мінск 16, 17, 19 і 20 сакавіка.

Учора пасольства Беларусі ў Літве арганізавала дастаўку грамадзян Беларусі, якія знаходзіліся ў Літве, па маршруце Вільнюс — пункт пропуску «Мядзінінкай». Акрамя таго, выезд з Літвы праз пункт пропуску «Райгардас-Прывалка» магчымы да Гродна сёння а 13-й і 17-й гадзінах на арганізаваным аўтобусе.

Таксама з 17 па 22 сакавіка будуць арганізаваны штодзённыя аўтобусы Бяла-Падляска — Цярэспаль — Брэст. (Адпраўленне з Бяла-Падляскі ў 12.00, з Цярэспаля — у 12.40). Для таго, каб трапіць у спіс пасажыраў, неабходна звязацца з консульствам Беларусі ў Бяла-Падляскі.

Грамадзяне Беларусі, якія маюць права на пастаяннае жыхарства ў Польшчы, могуць уехаць у Польшчу праз адкрытыя для асаблівага руху пагранічныя пераходы, але пры гэтым падлягаюць накіраванню на 14-дзённы каранцін. Унутраны аўтамабільны, чыгуначны і авіяцыйны транспарт у Польшчы будзе функцыянаваць.

Міністэрства замежных спраў Беларусі просіць грамадзян, якія апынуліся ў сітуацыі немагчымасці для вяртання на радзіму, паведамляць пра сябе ў адпаведныя замежныя ўстановы Беларусі або ў Міністэрства замежных спраў для аказання магчымага садзейнічання.

### Карысныя парады

Калі беларус знаходзіцца за мяжой у краіне, дзе выяўлены выпадкі віруснай інфекцыі COVID-19, калі дзяржава ўжо закрыла граніцы, распачала іншыя меры для абмежавання перамяшчэння людзей альбо ёсць падставы меркаваць, што такія меры будуць прыняты ў найбліжэйшы час, звяжыцеся з беларускім пасольствам або консульствам у краіне знаходжання, а пры іх адсутнасці там — у найбліжэйшай краіне, дзе яны ёсць.

Праверце тэрмін дзеяння візы, на падставе якой вы заехалі ў замежную дзяржаву. У выпадку, калі тэрмін дзеяння візы заканчваецца, абавязкова звярніцеся ў беларускае пасольства ці консульства для вырашэння пытанняў аб немагчымасці вашага выезду і даванні вам дадатковага часу без парушэння ўмоў візы па форс-мажорных абставінах.

Праверце тэрмін дзеяння наяўнай у вас медыцынскай страхоўкі. Калі страхоўка кароткатэрміновая ці вы бачыце, што яе тэрміну дзеяння відавочна не хопіць, аформіце мясцовую страхоўку адпаведнага тыпу або папрасіце вашых родных звязацца са страхавой кампаніяй у Беларусі, каб пашукаць механізм падаўжэння тэрміну дзеяння вашай страхоўкі або афармлення новай на ваша імя.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Будзь у курсе!

### ТЭРМІНЫ ВЯРТАННЯ ЧЫГУНАЧНЫХ БІЛЕТАЎ НЕ АБМЕЖАВАНЫ

**У сувязі з каранавірусам чыгуначная адміністрацыя Літвы апавясціла аб часовым прыпыненні і змяненні ўмоў курсіравання міжнародных цягнікоў і бесперасадачных вагонаў. Аналагічныя рашэнні прыняты Латвіяй, Польшчай, Украінай, Расіяй у дачыненні да міжнародных цягнікоў, якія ідуць праз тэрыторыю Беларусі.**

Куды пасажырам звяртацца па вяртанне грошай за нявыкарыстаныя білеты? Ці існуюць нейкія тэрміны для гэтага? Дзе можна адсачыць інфармацыю аб аднаўленні руху цягнікоў? Адказы на гэтыя пытанні даў прэс-цэнтр Беларускай чыгункі. Так, нявыкарыстаныя праязныя дакументы можна будзе вярнуць у білетных касах без збірання дадатковых плат і збораў. Вяртанне праязных плацяжоў па электронных праязных дакументах ажыццяўляецца праз інтэрнэт-рэсурс, на якім быў набыты праязны дакумент. Тэрміны вяртання праязных дакументаў не абмежаваны.

Пра аднаўленне руху цягнікоў будзе абвешчана дадаткова. Больш падрабязную інфармацыю аб раскладзе руху цягнікоў можна атрымаць на сайце www.rw.by, а таксама ў чыгуначных касах і па тэлефоне кантакт-цэнтра Беларускай чыгункі 105.

### НА ПЕРАНОС АВІЯПАДАРОЖЖА — НЕКАЛЬКІ МЕСЯЦАЎ

**У сувязі з сітуацыяй, якая пастаянна мяняецца, «Белавія» просіць правяраць абнаўленні на сайце авіякампаніі аб скасаваных рэйсах у сувязі з каранавірусам.**

Вяртанне сродкаў або змяненне даты вылету на адмененыя рэйсы можна будзе зрабіць да 31 снежня 2020 года.

«Звярнуцца ў касы, прадстаўніцтвы авіякампаніі, а таксама ў службу падтрымкі па гэтым пытанні можна будзе ў любы час да канца бягучага года. Не трэба рабіць гэта проста зараз — усе даныя вашага білета захаваны ў нас у сістэме, таму да нас можна звярнуцца і пасля меркаванай даты палёту, назваўшы нумар білета. Змена даты вылету магчыма толькі адзін раз. У вас ёсць некалькі месяцаў абдумаць, калі вы хочаце ляцець па гэтым білеце наступны раз», — растлумачылі ў авіякампаніі.

У выпадку звароту па вяртанні або абмене на рэйсы, якія выконваюцца і не адменены (групавы або індывідуальны тарыф), вяртанне і абмен будуць адбывацца ў адпаведнасці з правіламі тарыфу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ІНФАРМАЦЫЯ ПА КАРАНАВІРУСЕ — НА БЯСПЛАТНАЙ АСНОВЕ

**З 17 сакавіка ўсе абаненты мабільнага аператара life:) змогуць бясплатна тэлефанаваць на тэлефоны гарачых ліній Беларусі па пытаннях каранавіруса, а таксама на нумары экстранных ліній беларускіх дыпламатычных ведамстваў за мяжой. Званкі будуць бясплатныя на ўсіх тарыфных планах, у тым ліку ў роўмінгу.**

Нумары гарачых ліній па пытаннях каранавіруса ў Беларусі: +375 (29) 156-85-65; 8 (017) 334-34-68; 8 (0152) 55-25-02; 8 (0152) 75-53-22; 8 (0212) 67-36-44; 8 (0214) 74-39-44; 8 (0214) 57-36-44; 8 (0216) 51-34-41 і 51-34-48.

Сярод пасольстваў Беларусі за мяжой бясплатныя будуць званкі на экстранныя і гарачыя лініі Украіны, Польшчы, Расіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Казахстана, Турцыі, Германіі, Італіі, Аўстрыі, Ізраіля, Егіпта, Кітая, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Францыі, Швецыі і іншых краін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЯК ПРЫМУСІЦЬ ДЗЯРЖСЕКТАР ПРАЦАВАЦЬ ЭФЕКТЫЎНА

**Адказ на гэта пытанне спрабавалі знайсці дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разам з вучонымі і бізнесменамі. Круглы стол на тэму «Дзяржаўная палітыка ў сферы рэгулявання дзейнасці дзяржаўных арганізацый і гаспадарчых таварыстваў з удзелам дзяржавы. Прававыя і практычныя аспекты фарміравання і рэалізацыі» адбыўся ў Акадэміі кіравання Прэзідэнта.**

## З-ЗА ЧАГО «ТАРМОЗІЦЬ» ЭКАНОМІКА

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы Леанід БРЫЧ** растлумачыў журналістам, што такім чынам дэпутаты распачынаюць грамадскае абмеркаванне распрацаванай Міністэрствам эканомікі канцэпцыі законапраекта аб дзяржаўных арганізацыях і акцыянерных таварыствах з удзелам дзяржавы.



«На жаль, статыстыка сведчыць: прадпрыемствы дзяржсектара аказваюць стрымліваючы эфект на эканамічныя вынікі краіны. Не сакрэт, што на прадпрыемствах дзяржаўнай формы ўласнасці ўзровень вытворчасці працы ў 1,5-2 разы ніжэйшы, чым у арганізацыях прыватнай формы ўласнасці, на прадпрыемствах з удзелам замежнага капіталу на тэрыторыі Беларусі яна яшчэ вышэйшая, а калі казаць пра сумежныя дзяржавы — там яна вышэйшая ў разы, — канстатаваў парламентарый. — Захоўваецца нізкі ўзровень збытавога і інавацыйнага менеджменту. Не менш важная праблема — нізкі ўзровень унутранай кааперацыі, няўменне працаваць у бізнес-звязках, што зніжае эфектыўнасць кіравання вытворчасцю. На працягу апошніх трох гадоў у дзяржсектары фактычна не фарміраваўся рост дабаўленага кошту ў рэальным выражэнні».

У той жа час тэмпы росту прыватнага сектара эканомікі, па словах старшыні парламенцкай камісіі, склалі каля 103 працэнтаў, у арганізацыях замежнай формы ўласнасці — больш за 108 працэнтаў.

«Вырашэнне існуючых праблем нясе ў сабе вялізны патэнцыял для развіцця нацыянальнай эканомікі. Пра гэта кажуць прадстаўнікі і органаў улады, і бізнес-суполкі. Вынікам стане рост ВУП, зніжэнне міжрэгіянальнай дыферэнцыяцыі і павышэнне вытворчасці працы, — перакананы Леанід Брыч. — Нам патрэбна знайсці эфектыўныя прававыя механізмы, якія прымусілі б дзяржсектар працаваць па новым якасным узроўні, які адпавядаў бы самым высокім патрабаванням».

## АКЦЫІ ЗАМЕСТ КРЭДЫТАЎ

«Дасягнуць ВУП 100 мільярдаў долараў (да 2025 года, такую сярэднетэрміновую мэтавую ўстаноўку паставіў кіраўнік дзяржавы ў 2018 годзе. — **«Зв.»**) можна, толькі калі павысім эфектыўнасць функцыянавання дзяржаўнага сектара, бо ён займае вялікую долю, — пагадзіўся **загадчык кафедры дзяржаўнай эканамічнай палітыкі Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання Уладзіслаў ШЧЭПАЎ.** — Чыста матэматычна трэба пачынаць менавіта з павышэння вытворчасці працы і тэхналагічнага абсталявання прадпрыемстваў дзяржаўнага сектара. Па пэўных звестках некаторыя з такіх прадпрыемстваў адстаюць у выручцы на аднаго работніка ў разы».



Прадстаўнік навуковай суполкі ўпэўнены, што абмяркоўваць трэба і пытанні аб ролі дзяржавы ў эканоміцы, бо беларускія арганізацыі павінны быць прывабныя для інвестыцый.

«Нізкая рэнтабельнасць і закрэдытаванасць многіх дзяржпрадпрыемстваў не дазваляюць праводзіць іх мадэрнізацыю за кошт прыцягнутых сродкаў, — адзначыў Уладзіслаў Шчэпаў. — У нас вельмі шмат ААТ са стапрацэнтнай доляй дзяржавы, што выклікае пытанні. ААТ ствараліся для таго, каб прыцягваць інвестыцыі, прадаваць мінарытарныя пакеты, часам — мажарытарныя. Структура ўласнасці, галасаванне назіральнага савета, работа сходу акцыянераў непасрэдна ўплываюць на дзейнасць прадпрыемства, яго эфектыўнасць. Адсутнасць кансенсусу, пастаянныя скаргі перашкаджаюць інвестыцыйнаму працэсу. Ёсць аптымальная структура капіталу, якая дазваляе прадпрыемству развівацца».

Акрамя таго, у Беларусі слаба выкарыстоўваецца фінансавы рынак як інструмент прыцягнення інвестыцый, дадаў загадчык кафедрай.

«У нас свет клінам сышоўся на крэдытах і продажы альбо арэндзе плошчаў, але ў свеце асноўная крыніца фінансавання — акцыі (эмісія, дадатковая эмісія і продаж пэўнай часткі акцый). Гэты рынак трэба запускаць, бо мы трацім час і грошы — вельмі шмат інвестараў ходзіць вакол краіны і глядзіць. Яны не разумеюць, як працуе наша заканадаўства. Даводзіцца кожнаму інвестару тлумачыць, але ўсім не растлумачыш. Ёсць фонды, якія не жадаюць працаваць індывідуальна, яны купляюць альбо прадаюць акцыі на фінансавым рынку па зразумелых законах і правілах», — абгрунтаваў свой тэзіс Уладзіслаў Шчэпаў.

Ён дадаў, што патэнцыйна ў нас вельмі добры інвестыцыйны клімат: нізкі ўзровень карупцыі і ўдалае эканоміка-геаграфічнае становішча.

## ВЫБАР ШЛЯХУ

Распрацаваная Міністэрствам эканомікі канцэпцыя законапраекта аб дзяржаўных



арганізацыях і акцыянерных таварыствах з удзелам дзяржавы прадугледжвае фарміраванне новай сістэмы кіравання дзяржактывамі, звярнуў увагу **першы намеснік старшыні дзяржаўнага камітэта па маёмасці Аляксей ВАСІЛЬЕЎ.** Але ці так уж неабходна ламаць існуючую сістэму, задаўся ён пытаннем. «Другі варыянт — паступова вырашаць пытанні ў рамках дзеючай сістэмы. Нам трэба вызначыцца, якім шляхам мы пойдзем, каб больш прадметна працаваць над складнікамі», — сказаў прадстаўнік ведамства.

Канцэпцыя законапраекта была ўхвалена кіраўніком дзяржавы ў лістападзе 2019 года, паведаміў **намеснік міністра эканомікі Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ.** У маі Мінэканомікі ўжо павінна ўнесці законапраект у парламент, але гэта, па словах намесніка міністра, будзе прамежкавы варыянт.



«Пры падрыхтоўцы канцэпцыі мы разглядалі два сцэнарыі. Першы — сабраць пад адной вокладкай увесь масіў заканадаўства, які рэгулюе асновы функцыянавання дзяржаўных арганізацый. Другі — не толькі сабраць, але і істотна мадэрнізаваць гэты масіў. Калі мы ацанілі памеры работы, якая патрабуецца, то прыйшлі да высновы, што няма вострай неабходнасці разгортваць глабальнага характару работу, калі яна будзе зводзіцца да простага збірання нормаў у адно. Падрыхтоўка новага закона неабходная толькі ў тым выпадку, калі ён дазволіць прынамсі зняць вастрыню праблем».

Дзмітрый Ярашэвіч праблемай нумар адзін назваў груваскі, надзвычай дыферэнцыраваны і часам неэфектыўны дзяржаўны сектар.

«Сёння ён налічвае больш за 17,5 тысячы розных арганізацыйна-прававых формаў: звыш 15 тысяч розных устаноў, больш за 1600 унітарных прадпрыемстваў, каля 1600 гаспадарчых таварыстваў з удзелам дзяржавы, 42 дзяржаб'яднанні. Дзяржава сёння прысутнічае ва ўсіх галінах, відах дзейнасці, не абмяжоўваючыся аб'ектамі стратэгічнага значэння, як гэта прынята ў пераважнай большасці краін», — растлумачыў ён.

Дзяржава бярэ актыўны ўдзел у малым і сярэднім прадпрымальніцтве, дадаў прадстаўнік Мінэканомікі. Сёння каля 70 працэнтаў усіх дзяржаўных арганізацый — гэта суб'екты мікра-, малога і сярэдняга бізнесу. Пры гэтым выніковасць дзейнасці дзяржсектара, эфектыўнасць яго работы, на жаль, не такія значныя, як яго памеры, і, мякка кажучы, вымушаюць жадаць лепшага.

«Канкурэнтаздольнасць дзяржсектара на знешніх рынках зніжаецца, пра што сведчыць нездавальняючая тэндэнцыя скарачэння экспарту тавараў. З гэтага вынікае, што дзяржава павінна сканцэнтравацца на стратэгічна важных актывах, якія прыносяць даход, і дапамагчы ў гэтым павінна адэкватнае заканадаўства, якое дакладна вызначае палітыку і правілы функцыянавання дзяржсектара», — лічыць намеснік міністра.

Праблема нумар два, на думку Дзмітрыя Ярашэвіча, — адсутнасць выразнай і лагічна пабудаванай сістэмы кіравання дзяржсектарам.

«Што мы маем на сёння? Канцэпцыю «кіруй як разумееш», — ахарактарызаваў ён сітуацыю. — Кожны дзяржорган кіруе дзяржарганізацыяй з пазіцыі вузкаведамасных інтарэсаў. Таму нярэдка ўзнікаюць перакосы, і, што самае галоўнае, няма арыенціраў, да чаго імкнуцца».

Намеснік міністра абазначыў найбольш характэрныя кіраўніцка-арганізацыйныя праблемы: адсутнасць дакладна вызначанага пераліку відаў дзейнасці, у якой удзел дзяржавы вітаецца і з'яўляецца абгрунтаваным; тое ж самае і ў дачыненні да кіравання дзяржаўнымі актывамі.

«Цывілізаванае кіраванне гаспадарчымі таварыствамі немагчыма наладзіць пры дзеючай сістэме ўладальніцкага нагляду, — дадаў Дзмітрый Ярашэвіч. — Адсутнасць неабходнай колькасці часу, ведаў і кампетэнцый, вопыту не дазваляе прадстаўнікам дзяржавы рабіць належны ўнёсак у развіццё таварыстваў. А іх удзел у рабоце савета дырэктараў зводзіцца, як правіла, да фармальнай прысутнасці, давядзення кіраўнічых указанняў і даручэнняў органаў, якія ажыццяўляюць уладальніцкі нагляд».

Міністэрства эканомікі мяркуе, што гэтая частка заканадаўства патрабуе сістэмнага змянення падыходаў, і чым раней яны адбудуцца, тым лепей.

«У нас не ўстаноўлены нават мінімальныя дзяржаўныя стандарты карпаратыўнага кіравання ў дзяржсектары, — працягнуў пералік заканадаўчых прабелаў намеснік міністра. — Толькі ў дачыненні да кіраўнічых кампаній, холдынгаў удалося правесці мінімальнае патрабаванне да членаў саветаў дырэктараў, іх складу. Неабходна прызнаць, што ў частцы карпаратыўнага кіравання мы істотна адстаём ад краін — суседзяў».

Яшчэ адна неўрэгуляваная сфера — кадравая палітыка.

«Адказаў на тое, як неабходна фарміраваць органы кіравання дзяржаб'яднанняў, у якіх межах вызначаць кампетэнцыю і адказнасць органаў кіравання дзяржаб'яднанняў альбо ўнітарных прадпрыемстваў, заканадаўства не дае», — кажа намеснік міністра эканомікі.

Няма і адзіных падыходаў да пытанняў правядзення дывідэнднай палітыкі, вызначэння памеру дывідэндаў, парадку і тэрмінаў іх выплаты, выпадкаў, калі дывідэнды не выплачваюцца.

«Гэты закон патрэбны толькі ў тым выпадку, калі мы гатовы прызнаць шэраг разнапланавых праблем, якія звязаныя з заканадаўчым рэгуляваннем дзяржсектара, і рашуча мяняць правілы гульні для гэтай часткі эканомікі, — падсумаваў Дзмітрый Ярашэвіч. — Базавае правіла рызыкі — калі ад нейкіх выклікаў цярпіць дзяржаўны сектар, гэта адбіваецца на бюджэце з усімі наступствамі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

# Добраўпарадкаванне. Транспарт. Камунальныя паслугі

## Задача мясцовай улады — забяспечваць камфорт людзей на тэрыторыі іх пражывання

**Зварот па дапамогу ад работнікаў фермы пад Акцябрскім, просьба вырашыць праблему з транспартам на Веткаўшчыне і пытанні выдзялення зямлі фермерам з Буда-Кашалёўскага, Ельскага і Жыткавіцкага раёнаў... На працягу трох гадзін старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ прымаў тэлефонныя звароты грамадзян рэгіёна: патэлефанавала больш за сорак чалавек.**

Прамая лінія губернатара выйшла традыцыйна гарачая: паступаў званок, чалавек заяўляў пра праблему, Генадзь Салавей слухаў і, застаючыся на лініі, паралельна па тэлефоне даручаў кіраўнікам, у чыёй кампетэнцыі тэма, разабрацца.

Так, на прамую лінію патэлефанавалі жыхары вёскі Шкава Акцябрскага раёна. Адна з работніц тутэйшай гаспадаркі перадала калектыўную просьбу: ратуйце нашу ферму! Кармоў паступае недастаткова, няма ветурача, у выніку надоі ўпалі — ферму вось-вось закрыюць. Калектыў абяцаюць не кідаць, а вазіць у іншую гаспадарку, але работнікі са Шкавы — у асноўным сямейныя пары — хвалююцца, што страцяць работу. «Не перажывайце, ферма застанецца», — адказвае губернатар і тут жа па другой лініі дае даручэнне кіраўніцтву раёна разабрацца з пастаўкамі кармоў і ветдапамогай для гаспадаркі.


Фота БелТА.

Па дапамогу да кіраўніка рэгіёна ад імя вяскоўцаў з Навасёлак, Ягаднага, Шарсціна, Радугі, што ў Веткаўскім раёне, звярнулася мясцовая жыхарка адной з вёсак. «Рэйсавы аўтобус ходзіць толькі ўранку і позна ўвечары. Маршрутчыкі раніцай у панядзелак і аўторак наогул ладзяць сабе выхадны. Людзям не дабрацца, а што рабіць, калі большасць вясковых працуе ў горадзе», — абураецца Тацяна Іванаўна і ад імя вяскоўцаў просіць вырашыць праблему з транспартным забеспячэннем.

Прыняцця рашэння па некалькіх калектыўных зваротах чакаюць таксама жыхары Гомеля. Старшыня гаражнага кааператыва па вуліцы Віцебскай патэлефанавала з просьбай дапамагчы наладзіць электразабеспячэнне: чацвёрты год на аб'екце няма святла. Генадзь Салавей адразу звязаўся з кіраўніцтвам РУП «Гомельэнерга»: пастаўлена задача ў кароткі тэрмін разабрацца ў прычынах «светлавога калапсу» і дапамагчы людзям.

Гамяльчанін Андрэй Гарыевіч агучыў просьбу жыхароў шматпавярховак па вуліцах 2-й Авіяцыйнай, Кожара, Савецкай. Людзі просяць афіцыйна надаць статус сквера зялёнай зоне ў раёне гасцініцы «Турыст». Яны звяртаюць увагу, што па генплане такі статус мае толькі 0,6 гектара зямлі ў скверы, але неабходна захаваць усю тэрыторыю парку. Мужчына паведаміў, што жыхары дамоў актыўна добраўпарадкоўваюць тэрыторыю: высадзілі дзясяткі дрэў, самі забяспечваюць паліўку пасадак. Для іх важна абараніць зялёны куток ад магчымай забудовы па ўшчыльненні.

— Рашэнне ў гэтай сітуацыі адназначнае: мы павінны захаваць зялёную зону, — супакойвае Генадзь Салавей. Пытанне захавання сквера застанецца на кантролі.

Падчас прамой лініі гамяльчане таксама паднялі праблему водазабеспячэння ў дамах у цэнтры горада па вуліцы Артылерыйскай. Высветлілася, што з-за тэхнічнага застою раніцай з кранаў ідзе рудая вада.

— Уся вада, якая пастаўляецца ў кватэры, павінна быць належнай якасці, — каментуе Генадзь Салавей і дае даручэнне адказным арганізацыям вырашыць праблему з іржавай вадой.

Між тым некалькі гамяльчан патэлефанавалі і з калектыўнымі падзякамі на адрас улад. Так, актывісты Савецкага раёна Гомеля папрасілі губернатара ацаніць добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, якое робіцца сіламі грамадзян і камунальнікаў. Жыхары мікрараёна Хутар падзякавалі за ўвагу да развіцця інфраструктуры ў масіве новабудоўляў. Пасля сустрэчы губернатара з ініцыятыўнай групай «хутаранцаў» пачалася распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі для будучай школы. Карыстаючыся выпадкам, жыхары мікрараёна закранулі пытанне выкарыстання будынка былога дзіцячага дома на «Крышталі». Плануецца размясціць там паліклініку, паведамілі ў аблвыканкаме.

Пасля прамой лініі журналісты пацікавіліся ў Генадзя Салаўя пра яго меркаванне наконт эфектыўнасці работы з тэлефоннымі зваротамі грамадзян.

— Калі праблема вырашальная, рэакцыя павінна быць імгненная, — адзначыў старшыня аблвыканкама. — Часам вырашэнне таго ці іншага вострага пытання патрабуе дадатковага вывучэння і больш грунтоўнага разгляду. Людзі шукаюць дапамогі не толькі ў сваім рэгіёне, звяртаюцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта, у іншыя органы.

На думку кіраўніка рэгіёна, у раёнах праблемы людзей можна вырашыць больш аператыўна. Менавіта мясцовыя ўлады павінны забяспечваць камфорт людзей на тэрыторыі іх пражывання.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# КРАЙНІ ТЭРМІН — 31 САКАВІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб падаць дэкларацыю ў электронным выглядзе, трэба звярнуцца ў любы падатковы орган з пасведчаннем асобы і атрымаць там лагін і пароль для ўваходу ў асабісты кабінет. Прычым любую дапамогу кліентам падатковая аказвае бясплатна.

Па падліках спецыялістаў, сёлета дэкларацыі пададуць крыху больш за 35 тысяч чалавек. А гэта значыць — больш за 20 тысяч справаздач будзе пададзена за 20 дзён.

## Найбольшы падатак — 3,2 мільёна рублёў

Таксама ў міністэрстве падзяліліся звесткамі аб тым, колькі дэкларацый падалі ў 2019 годзе. Іх аказалася 34 589, што на 1965 больш, чым годам раней. Больш за 12 тысяч дэкларацый было пададзена ў Мінску, яшчэ прыкладна па 4,5 тысячы прыйшлося на Мінскую і Гомельскую вобласці, а ў астатніх рэгіёнах было прыблізна па 3 тысячы. Даплаціць падаходны падатак давялося каля 22,3 тысячы чалавек, якія падалі дэкларацыю. Агульная сума склала 64 мільёны рублёў. А некаторыя атрымалі вяртанне падатку — такіх у 2019 годзе было 1188 чалавек, ім вярнулі 1,7 мільёна рублёў.

Тых, хто не падаў дэкларацыю своечасова, у 2019 годзе было 3660 чалавек. Па выніках праверак ім давялося заплаціць 3,6 мільёна рублёў падаткаў і яшчэ 425 тысяч рублёў штрафаў.

Рэкардсменам па задэклараваным даходзе і, адпаведна, заплачаным падатку ў 2019 годзе стаў жыхар Мінскага раёна. Ён задэклараваў 25 мільёнаў рублёў, а яго падатак склаў 3,2 мільёна рублёў. Як расказаў Міхаіл Расолька, беларус атрымаў гэты даход у выніку аперацый з каштоўнымі паперамі. Які даход акажацца самы вялікі ў 2019 годзе, пакуль невядома.

## Хто павінен «варушыцца» цяпер

Падатковую дэкларацыю абавязаны прадставіць фізічныя асобы (рэзідэнты нашай краіны), якія атрымалі ў 2019 годзе даходы ад продажу маёмасці (напрыклад, двух і больш легкавых аўтамабіляў, грузавога аўтамабіля або аўтобуса), а таксама ад продажу на працягу пяці гадоў другой (і больш) кватэры, дома, дачы, гаража, зямельнага ўчастка.

Пры атрыманні на працягу 2014—2019 гадоў даходаў ад продажу аднаго наймення аб'екта нерухомасці, напрыклад, у 2015 годзе — адной (!) кватэры, а ў 2019 годзе — аднаго (!) жылога дома, грамадзянін не абавязаны прадстаўляць падатковую дэкларацыю, бо такія даходы вызваляюцца ад падаходнага падатку.

Таксама дэкларуюцца па выніках года даходы ад продажу больш чым аднаго (на працягу пяці апошніх гадоў) не завершанага будаўніцтвам капітальнага будынка, размешчанага на зямельным участку, выдзеленым для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, садоўніцтва, дачнага будаўніцтва, у выглядзе службовага надзела.

У дачыненні да аб'ектаў камерцыйнай нерухомасці колькасная падатковай льготы не існуе. Калі ўласнік прадаў нават не больш за адно гандлёвае, офіснае або адміністрацыйнае памяшканне, ён абавязаны запоўніць дэкларацыю і аплаціць падаходны падатак.

**Ёсць выключэнне з правіл. Можна прадаваць за кароткі тэрмін любую колькасць дамоў, дач або зямельных участкаў ці іншай нерухомасці, калі ўсё гэта было атрымана ў спадчыну. Плаціць падаткі ў гэтым выпадку не трэба незалежна ад перыядычнасці адчужэння нерухомасці на працягу пяцігадовага перыяду.**

Спецыялісты падатковай галіны асобна адзначаюць, што абавязкова дэкларуюцца любыя фінансавыя ўліванні, што былі атрыманы грамадзянамі за мяжой і (або) з-за мяжы нашай краіны. Але папярэдне трэба высвятліць, што чалавек сапраўды быў прызнаны ў 2019 годзе падатковым рэзідэнтам Беларусі (фактычна знаходзіўся на працягу мінулага года больш за 183 дні на тэрыторыі краіны).

Гэта могуць быць грошы ад работы па найме (кантракце), ад продажу акцый або іншых каштоўных папер, ад продажу долю ў статутных фондах замежных арганізацый, у выглядзе працэнтаў па рахунках (укладах) у замежных банках, атрыманыя ў дар ад замежных грамадзян і іншае.

І яшчэ: у мінулыя гады ўсе тыя, хто здаваў уласную кватэру на працяглы тэрмін, плацілі фіксаваны падатак. Але, акрамя гэтага, яны павінны былі падлічыць прыбытак ад здачы ў арэнду жылых і нежылых памяшканняў за ўсе 12 месяцаў. Калі ён дасягаў агульнай сумы 6 тысяч рублёў і больш, трэба было наведаць падатковую інспекцыю і выплаціць дадатковы падатак.

Напрыклад, у 2018 годзе 1557 беларусаў даплацілі падаходны падатак за здачу нерухомасці ў арэнду. Яны дадаткова пералічылі ў казну 1,8 мільёна рублёў. Але з 2019 года абавязак падаваць дэкларацыю і плаціць падатак у такой сітуацыі адмянілі.

Паведаміць падатковай трэба таксама пра падарункі, калі іх кошт перавышае 6569 рублёў ад усіх крыніц на працягу года. Выключэнне складаюць даходы, атрыманыя чалавекам ад блізкіх сваякоў і асоб, якія знаходзяцца з ім у адносінах сваяцтва, такія даходы не прызнаюцца аб'ектам падаткаабкладання незалежна ад памеру. Да асоб, якія знаходзяцца ў адносінах блізкага сваяцтва, адносяцца бацькі (усынавіцелі, удачарыцелі), дзеці (у тым ліку ўсыноўленыя, удочараныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, прадзед, прабабка, праўнукі, муж і жонка. Да асоб, якія знаходзяцца ў адносінах сваяцтва, адносяцца блізкія сваякі аднаго з сужэнцаў, у тым ліку памерлага.

## Тэрмін выплаты і штрафы

У сакавіку для зручнасці грамадзян падатковыя органы праводзяць прыём дэкларацый у рабочыя дні з 8.00 да 19.00. Традыцыйна падатковыя працуюць і ў выхадныя — дзве апошнія суботы да дэдлайну падачы (як правіла з 9.00 да 13.00). Сёлета гэта будзе 21 і 28 сакавіка. Дакладны графік можна даведацца ў сваёй інспекцыі.

Падаходны падатак, вылічаны падатковым органам на падставе прадстаўленай фізічнай асобай падатковай дэкларацыі за 2019 год, падлягае выплаце ў бюджэт у тэрмін не пазней за 1 чэрвеня.

Парушэнне тэрміну прадстаўлення ў падатковы орган дэкларацыі за 2019 год цягне накладанне штрафу ў памеры ад дзвюх базавых велічынь з павелічэннем яго на 0,5 базавай велічыні за кожны поўны месяц пратэрміноўкі, але не больш за 10 базавых велічынь. Для даведкі: з 1 студзеня 2020 года базавая велічыня складае 27 рублёў. Такім чынам, памер штрафу можа скласці ад 54 да 270 рублёў.

Парушэнне кліентам тэрміну аплаты падаходнага падатку (1 чэрвеня 2020 года), вылічанага на падставе прадстаўленай падатковай дэкларацыі за 2019 год, калі нявыплачаная або не цалкам выплачаная сума падатку перавышае адну базавую велічыню, цягне накладанне штрафу ў памеры 15 % ад нявыплачанай сумы падатку, але не менш за 0,5 базавай велічыні.

## Стварaецца база з пашыранай інфармацыяй аб даходах насельніцтва

Як адзначыў Міхаіл Расолька, «база даходаў у падатковых органах створана, гаворка ідзе аб яе напаўненні». Цяпер у яе аўтаматычна трапляюць звесткі аб даходах ад продажу нерухомасці (іх падае Дзяржаўны камітэт па маёмасці), продажу транспартных сродкаў (ДАІ) і грашовых пераводах з-за мяжы (банкі, пошта, сістэмы грашовых пераводаў).

«Сёння ў нас разглядаецца пытанне наконт загрузкі інфармацыі аб даходах, якія грамадзяне атрымліваюць па месцы работы — удакладніў спецыяліст. — Гэта накіравана на стварэнне для грамадзян магчымасці менш звяртацца па даведкі ў нейкія органы або для іншых дзяржаўных органаў не абавязваць грамадзян звяртацца па даведкі. Адпаведна, калі спатрэбіцца інфармацыя аб даходах грамадзяніна, грамадзянін можа ў асабістым кабінеце атрымаць адпаведную інфармацыю, раздрукаваць і скарыстацца ёю».

Раней у міністэрстве адзначалі, што хочуць уключаць у базу даныя пра ўсе віды налічаных даходаў, звесткі не толькі аб зарплаце, але і аб дывідэндах, працэнтах па банкаўскіх дэпазітах і іншым.

Тая інфармацыя, якая цяпер ёсць у базе, таксама можа быць карысная для беларусаў. На яе падставе запаўняецца папярэдняя падатковая дэкларацыя ў электронным выглядзе. Адпаведна, любы чалавек можа зайсці ў асабісты кабінет на сайце падатковай, сфарміраваць дэкларацыю на аснове наяўных звестак, праверыць яе, пры неабходнасці дапоўніць і падаць анлайн.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ГРОДНЕНСКИЙ ФИЛИАЛ
РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 413/С-21427 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад запчастей), общей площадью 160,9 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/1, склад запчастей; капитальное строение, инв. № 413/С-21428 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – котельная), общей площадью 81,8 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/2, котельная; капитальное строение, инв. № 413/С-21432 (назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции, наименование – обменный пункт), общей площадью 203,2 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/3, обменный пункт; капитальное строение, инв. № 413/С-21424 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – мастерские), общей площадью 797,2 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/4, мастерские; капитальное строение, инв. № 413/С-21425 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – нефтебаза), общей площадью 44,4 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/5, нефтебаза; капитальное строение, инв. № 413/С-21431 (назначение – здание специализированное транспорта, наименование – гараж для комбайнов), общей площадью 727,2 кв. м, расположенное по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, ул. Центральная, 30А/6, гараж для комбайнов.
Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 425285717601000123 площадью 3,2827 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений 1 01 09), расположенном по адресу: Свислочский р-н, Порозовский с/с, д. Сокольники, У-1315. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей напряжением до 1000 вольт площадью 0,1224 га, код 5,2; земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора площадью 0,4936 га, код 2.7

Начальная цена продажи – 62 776 руб. (шестьдесят две тысячи семьсот семьдесят шесть рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 6 277 руб. (шесть тысяч двести семьдесят семь рублей)

**Продавец – Унитарное сельскохозяйственное предприятие «Совхоз «Порозовский», 231982, Свислочский р-н, г. п. Порозово, ул. Я. Колоса, 2, тел./факс 8-01513-203-42**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 2 апреля 2020 г. в 14.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 05.06.2019 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 31 марта 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ГРОДНЕНСКИЙ ФИЛИАЛ
РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 401/С-33527 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – кафе «Визит»), общей площадью 1410,10 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3**

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422050400002002738, площадью 0,2690 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 3. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2,4, площадью 0,2690 га

Начальная цена продажи – 192 000 руб. (сто девяносто две тысячи рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 19 200 руб. (девятнадцать тысяч двести рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

**Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Гродненский филиал), 230003, г. Гродно, ул. Озерское Шоссе, 41, тел. 39-29-90**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 17 апреля 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.01.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 15 апреля 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ГРОДНЕНСКИЙ ФИЛИАЛ
РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 451/С-14959 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – кондитерский цех), площадью 213,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Дятлово, ул. Горького, 3.
Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422350100001001184, площадью 0,0305 га (назначение – обслуживании кондитерского цеха), расположенном по адресу: г. Дятлово, ул. Горького, 3. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0002 га

Начальная цена продажи – 7 488 руб. (семь тысяч четыреста восемьдесят восемь рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 748 руб. (семьсот сорок восемь рублей)

**Продавец – Дятловский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, тел. 8-01563-216-82**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 20 апреля 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.01.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 16 апреля 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

ОБЪЯВЛЕНИЕ

## ОАО «Минскоблхлебопродукт»

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 31 марта 2020 года по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2. Начало собрания в 10.00**

**Регистрация акционеров с 09.30 до 09.55**

При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

Об увеличении уставного фонда ОАО «Минскоблхлебопродукт» путем проведения закрытой подписки на простые (обыкновенные) акции.

Об утверждении результатов закрытой подписки на простые (обыкновенные) акции ОАО «Минскоблхлебопродукт» дополнительного выпуска и решения о дополнительном выпуске акций.

Об утверждении уставного фонда ОАО «Минскоблхлебопродукт».

О внесении изменений в Устав ОАО «Минскоблхлебопродукт» в части увеличения размера уставного фонда.

***Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт».*** УНП 600013173

## Открытое акционерное общество «Паритетбанк»

(Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселева, 61а) сообщает, что в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» от 13.03.2020 признается утратившим силу решение Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» от 05.02.2020 по вопросу «О проведении внеочередного Общего собрания акционеров 20.03.2020», в соответствии с которым внеочередное Общее собрание акционеров в очной форме было назначено к проведению на 20.03.2020.

Телефон для справок +375 (17) 237 76 79.

**Сайт: paritetbank.by**
УНП 100233809
Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5.

## ЗАО «Белреализация» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Трест Белтрансстрой»** (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8, тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТКОНСАЛТ».

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **17 апреля 2020 г.** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Морской контейнер, 6*2,45, инв. № 177 | 2 326,04 |
| 2 | Бытовка «Штаб», 6*4,8, инв. № 7249 | 6 782,94 |
| 3 | Бытовка «Прорабская», 6*4,8, инв. № 696 | 5 503,14 |
| 4 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 7276 | 4 543,29 |
| 5 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.41 | 4 543,29 |
| 6 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.36 | 4 543,29 |
| 7 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.30 | 5 631,12 |
| 8 | Бытовка, 6*2,45, инв. № 110.39 | 4 543,29 |
| 9 | Станок для резки арматуры, инв. № 110.94 | 3 033,13 |
| 10 | Станок для гибки арматуры, инв. № 110.90 | 3 743,42 |

**Местонахождение предметов торгов:** РФ, Калужская обл., г. Балабаново, ул. Гагарина, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 18.03.2020 г. с 09.00 по 16.04.2020 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

### 26 марта 2020 года на 5-м открытом аукционе проводит 4-й от 12 марта 2020 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 36 | Грузовой бортовой Урал-4320 ш. 018153 дв. 507471 1983 г. *4 кат. 61055 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8 100,00 | 1 620,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **26 марта 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 часов 23 марта 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **26 марта 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, **Без НДС**. **Справки по тел./факс: (017) 398 05 41.**

Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» № 23 от 5.02.2020 г.

## Извещение о проведении 30 марта 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| «Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а 1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211 |
| Местонахождение – Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1 |
| Начальная цена – 1 790 445,60 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка – 179 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», 220035, г. Минск, пр-т Машерова, 80, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 30 марта 2020 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 17.03.2020 по 26.03.2020 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-58, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

Парламенцкі дзённік

# РОЎНЫЯ ПРАВЫ І АСАБЛІВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі прапановы па праекце закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі»**

**Пастаянная камісія па працы і сацыяльных пытаннях рыхтуе праваны акт да першага чытання. Колькасць людзей з інваліднасцю паступова павялічваецца. На 1 студзеня 2020 года іх налічваецца больш за 572 тысячы чалавек. Па словах намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандра РУМАКА, інваліднасць імі разглядаецца як з'ява сацыяльная. Таму акцэнт робіцца на сацыяльным забеспячэнні патрабаванняў людзей з інваліднасцю і інклюзіі.**

Законам будуць вырашаны такія значныя пытанні, як замацаванне паркавачных месцаў для людзей з інваліднасцю, абсталяванне даступнага асяроддзя ў жылых дамах і ўстановах, куды яны звяртаюцца па аказанне паслуг. «Шмат увагі ўдзяляецца таксама забеспячэнню права на працу для людзей з інваліднасцю. Нельга падзяляць правы людзей з інваліднасцю па ступені важнасці, але ўсё ж такі забяспечыць права на працу для чалавека з інваліднасцю, які жадае працаваць, — гэта абавязак усіх дзяржаўных структур, якія займаюцца гэтымі пытаннямі», — сказаў Аляксандр Румак.

Сёння з дапамогай органаў улады занятыя каля 60 працэнтаў людзей з інваліднасцю працаздольнага ўзросту і тых, хто мае магчымасць працаваць згодна з рэкамендацыямі МРЭК. Дзякуючы садзейнічанню органаў па працы і занятасці, сацыяльнай абароны штогод рабочыя месцы атрымлівае каля 40 працэнтаў інвалідаў, што звяртаюцца з гэтай мэтай. Арганізацыям, зацверджаным грамадскімі аб'яднаннямі інвалідаў, і іншым, што маюць у складзе 30 і больш працэнтаў людзей з інваліднасцю, дадзены шэраг ільгот у эканамічнай сферы. Як адзначыў намеснік міністра, гэтая норма пацвярджае, што ў Беларусі рэалізуюцца правы людзей з інваліднасцю на працу і сістэма садзейнічання іх працаўладкаванню пастаянна ўдасканальваецца. Наша краіна далучэннем да Канвенцыі аб правах інвалідаў і яе ратыфікацыяй узяла на сябе абавязкі па выкананні міжнародных нормаў ў адносінах да такіх людзей.

Удзельнікамі пашыранага пасяджэння Пастаяннай камісіі па працы і занятасці былі прадстаўнікі кіраўніцтва і структурных падраздзяленняў разнастайных міністэрстваў — архітэктуры і будаўніцтва, працы і сацыяльнай абароны, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аховы здароўя, інфармацыі, адукацыі, транспарту і камунікацый. Запрасілі да ўдзелу і грамадскія аб'яднанні інвалідаў: Беларускае таварыства інвалідаў па зроку, Беларускую асацыяцыю дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам, Беларускае таварыства інвалідаў, Беларускае таварыства глухіх, Рэспубліканскую асацыяцыю інвалідаў-калясачнікаў.

**Старшыня Цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства інвалідаў Уладзімір ПАТАПЕНКА** расказаў пра пажаданні па ўдасканаленні закона і міжнародны вопыт у сферы работы органаў дзяржаўнага кіравання з інвалідамі. Так, сярод прапаноў людзей з інваліднасцю стварэнне органа, дэпартамента ці абудсмена пры Адміністрацыі Прэзідэнта, які б кантраляваў работу з інвалідамі, магчымасць заснаваць цэнтры рэабілітацыі і абілітацыі ўсіх формаў уласнасці.

Дарэчы, працаваць над законапраектам пачаў яшчэ мінулы склад дэпутатаў. Паслядоўнікі працягнулі дзейнасць. З палажэннямі закона былі азнаёмлены зацікаўленыя амаль ва ўсіх выбарчых акругах.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Інавацыі ў адукацыі

# IT І ІНКЛЮЗІЯ: ТРЫВАЛЫ САЮЗ

**Не сакрэт, што выбар прафесіі для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця абмежаваны станам здароўя і далёка не заўсёды іх патрэбы і жаданні супадаюць з шанцамі авалодаць той ці іншай спецыяльнасцю. Але дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям адукацыйныя магчымасці для людзей з інваліднасцю пашыраюцца.**



— Прафадукацыя імкнецца да таго, каб максімальна ўкараніць вэб-тэхналогіі ў працэс навучання. Рэгулярна праводзяцца конкурсы сайтаў, каб вызначыць, наколькі яны даступныя людзям з абмежаваннямі па слыху ці зроку, — падкрэслівае **начальнік аддзела Цэнтра навукова-метадычнага забеспячэння прафесійнай адукацыі Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Алена ФАЛЕВІЧ.** — Таксама шырока выкарыстоўваюцца электронныя адукацыйныя рэсурсы. Сёлета на базе Магілёўскага дзяржаўнага эканамічнага прафесійна-тэхнічнага каледжа арганізавана эксперыментальная пляцоўка для асоб з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарата. Іх навучанне вядзецца з максімальным прыцягненнем элементаў дыстанцыйнага навучання.

Алена Фалевіч дадала, што сёлета каманда маладых спецыялістаў, якія маюць пэўныя псіхафізічныя парушэнні, возьме ўдзел у рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus. Анлайн-пляцоўкі будуць працаваць у Магілёўскай вобласці для навучэнцаў з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарата, а ў Мінску — для тых, хто мае праблемы са слыхам або зрокам.

**Начальнік Цэнтра развіцця інфармацыйных тэхналогій БДПУ імя М. Танка Аксана МІНІЧ** паведаміла, што ў краіне рэалізуецца шэраг праграм па інфарматызацыі адукацыі. Згодна з Нацыянальным планам дзеянняў па рэалізацыі палажэнняў Канвенцыі аб правах інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь, на перыяд да 2025 года павінны быць выкананы патрабаванні па адаптыўнасці інфармацыі для студэнтаў са слабым зрокам.

Таксама на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта дзейнічае рэспубліканскі рэсурсны Цэнтр інклюзіўнай адукацыі, дзе рыхтуюць настаўнікаў, лагапедаў, дэфектолагаў, аказваюць кансультатыўную дапамогу як дзецям з псіхафізічнымі парушэннямі, так і іх бацькам.

— У БДУ ў навучальным працэсе задзейнічана шмат інфармацыйных адукацыйных рэсурсаў, у тым ліку для студэнтаў з псіхафізічнымі парушэннямі, — расказала **загадчыца вучэбна-метадычнай лабараторыі інавацый у адукацыі ўніверсітэта Наталля МАРОЗАВА.** — На сёння сістэма кіравання навучаннем вядзецца праз адукацыйны партал, створаны на базе даных у сістэме Moodle: у ёй функцыянуе каля дзвюх тысяч навучальных дысцыплін практычна па ўсіх спецыяльнасцях. Карыстаюцца паслугамі адукацыйнага партала прыблізна 12 тысяч студэнтаў. Да таго ж у БДУ навучаюцца 84 студэнты з пэўнымі асаблівасцямі, для іх створаны індывідуальны план і графік навучання.

— Інклюзія — гэта пра сацыялізацыю і адаптацыю тых, у каго ёсць асаблівыя патрэбы, — упэўнены **майстар вытворчага навучання Мінскага дзяржаўнага каледжа электронікі, невідушчы карыстальнік інтэрнэту Аляксандр СЕВЯРЫН.** — Я быў уключаны ў працэс вочнай і дыстанцыйнай формы навучання як выкладчык і як навучэнец у розныя часы: дваццаць гадоў таму, дзесяць і цяпер. Лічу, што ў 2020 годзе трэба перастаць здзіўляцца таму, што людзі з абмежаванымі магчымасцямі карыстаюцца камп'ютарнай тэхнікай і гаджэтамі. Тэхнічны прагрэс рушыць хутка. У 2011 годзе ў мяне з'явіўся мабільны тэлефон, яшчэ раней, у 2004 годзе, — камп'ютар. Гэтага дастаткова для таго, каб з дапамогай сучасных інфармацыйных тэхналогій атрымліваць адукацыю. Аднак варта разумець: яны даступныя не ўсім і не аднолькава. Таму трэба ствараць адаптаваны кантэнт, удасканальваць навыкі па выкарыстанні IT і ўкараняць іх. Напрыклад, карыстанню сэнсарным смартфонам трэба навучыцца, і не ўсе невідушчыя могуць гэта зрабіць самастойна, а настаўнікі або выкладчыкі не заўсёды могуць дапамагчы. Што датычыцца сістэмы Moodle, то яна для нас даступная, але кантэнт, размешчаны ў ёй, часам бывае няякасны: каля 40 працэнтаў матэрыялаў даецца ў скрыншотах — для нас гэта перашкода...

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Ахова здароўя

# ЭКСПЕРТЫЗА ЯКАСЦІ І АБГРУНТАВАНАЯ РЫЗЫКА

**Якія новаўвядзенні чакаюць урачоў і пацыентаў**

**Лекі за кошт бюджэту на дзённым стацыянары, пашыраны пералік медыцынскіх установ, дзе можна прайсці медагляд, экспертыза якасці аказання медыцынскай дапамогі, акрэдытацыя медыцынскіх установ — гэтыя і іншыя змены з'явяцца ў Законе «Аб ахове здароўя», які ўступіць у дзеянне ў 2021 годзе. Пра новаўвядзенні расказала намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Валянціна КУРСЕВІЧ.**

Экспертыза якасці медыцынскай дапамогі будзе прымяняцца ў выпадках усіх лятальных зыходаў, бальнічнай інфекцыі і ўскладненняў, паўторнай шпіталізацыі на працягу года з нагоды аднаго і таго ж захворвання, выпадках, якія суправаджаюцца скаргамі на якасць аказання медыцынскай дапамогі.

— Раней такая экспертыза таксама была, але яе праводзіла лячэбна-кантрольная камісія той установы, дзе здарылася падобная сітуацыя. Цяпер гэта будзе ажыццяўляць зусім іншая дзяржаўная ўстанова — абласная медыка-рэабілітацыйная экспертная камісія, якая дасць ацэнку якасці аказання медыцынскай дапамогі, — растлумачыла Валянціна Курсевіч. — Напрыклад, адбыўся лятальны выпадак у аддзяленні кардыялогіі. Будзе разглядацца не толькі работа гэтага аддзялення — дадуць ацэнку дзейнасці ўсёй лячэбнай установы. Напрыклад, спазніліся ў аказанні дапамогі пацыенту з інфарктам, бо своечасова не ўзялі яго на каранаграфію. У чым праблема? Не працаваў ангіёграф. Чаму? Не было спецыяліста ці апарат зламаўся і своечасова не даставілі запасную частку? З усім гэтым будзе разбірацца экспертная камісія.

Бясплатнымі стануць лекі ў аддзяленнях дзённага знаходжання, так званых дзённых стацыянарах.

— Для насельніцтва гэта самы адчувальны момант, бо яны змогуць атрымаць бюджэтную дапамогу. Калі раней пацыент ішоў да ўрача, які выпісваў яму рэцэпт, а затым набываў лекі ў аптэцы за свае сродкі, то цяпер усе прэпараты ён атрымае ў дзённым стацыянары бясплатна. Такім чынам, зменшыцца колькасць шпіталізацый, а сродкі будуць пераразмеркаваны са стацыянарнай на амбулаторна-паліклінічную дапамогу, — падкрэсліла парламентарый. — Гэта актуальна для працаздольных грамадзян з ішэмічнай хваробай сэрца, артэрыяльнай гіпертэнзіяй, хранічнай абструктыўнай хваробай лёгкіх. Яны змогуць праходзіць лячэнне ў аддзяленні дзённага стацыянара, дзе ім падбяруць лекавыя сродкі. Напрыклад, на рабоце ў чалавека здарыўся гіпертанічны крыз. Пацыента прывозяць у стацыянар, дзе яму аказваюць дапамогу, а далей у аддзяленні дзённага знаходжання ўрач падбярэ прэпараты для нармалізацыі артэрыяльнага ціску.

У абноўленым законе з'явіцца і такое паняцце, як абгрунтаваная прафесійная рызыка.

— Калі медыцынская дапамога аказана ў поўнай адпаведнасці з клінічным пратаколам, урач выканаў усё, што неабходна, але вынік не быў дасягнуты, — гэта абгрунтаваная прафесійная рызыка, — растлумачыла Валянціна Курсевіч.

Новы законапраект прадугледжвае і пашырэнне пераліку медыцынскіх установ, дзе можна будзе прайсці медагляд. У прыватнасці, з'явіцца такая магчымасць у медсанчасцях буйных прадпрыемстваў, такіх як Мінскі трактарны завод, Мінскі завод халадзільнікаў «Атлант», БелАЗ. Таксама любое прадпрыемства зможа заключыць дагавор на праходжанне медагляду сваімі супрацоўнікамі ў прыватных медыцынскіх цэнтрах.

Уводзіцца і працэдура акрэдытацыі. Усе дзяржаўныя медыцынскія ўстановы павінны яе прайсці да 1 студзеня 2023 года.

— У шэрагу ўстаноў існуюць метады аказання дапамогі, якія адстаюць ад сучаснага ўзроўню, выконваюцца ў малых аб'ёмах, але патрабуюць вялікіх сродкаў. У будучым такая дапамога будзе сканцэнтравана на базе міжраённых цэнтраў. Прывяду прыклад Мінскай вобласці: міжраённыя цэнтры ствараюцца ў Бараўлянах, Салігорску, Маладзечне і Барысаве. Усе раёны будуць размеркаваны па гэтых цэнтрах, каб пацыент, скажам, з вострым інфарктам міякарда быў дастаўлены туды ў кароткі прамежак часу, яму была зроблена каранаграфія і аказана далейшая дапамога на высокім узроўні, — адзначыла Валянціна Курсевіч. — Ніякія аддзяленні медустаноў, якія не адпавядаюць сучасным патрабаванням, закрыты не будуць. Яны будуць перапрафіляваны пад аказанне пэўных відаў запатрабаванай дапамогі — тэрапеўтычнай, кардыялагічнай і іншых.

**Алена КРАВЕЦ.**

У цэнтры ўвагі

# НЮАНСЫ РАЗМЕРКАВАННЯ

## Як сумясціць інтарэсы выпускніка і наймальніка?

**Сёлета з улікам выпускаў, якія адбудуцца ва ўстановах прафесійнай адукацыі нашай краіны, плануецца размеркаваць каля 19 тысяч спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, 18 тысяч з сярэдняй спецыяльнай і 23 тысячы рабочых з прафтэхадукацыяй. Пра гэта падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА паведаміў начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.**

— Калі казаць пра недахоп рабочых месцаў, то такіх момантаў мы не прагназуем. Справа ў тым, што сама працэдура размеркавання прадугледжвае значную ступень гнуткасці, — падкрэсліў спецыяліст. — Камісіі па размеркаванні ва ўстановах адукацыі будуць мець пул заявак, якія сфарміраваны ў доўгатэрміновым плане, і пул разавых заявак. Пытанне толькі ў тым, каб максімальна задаволіць інтарэсы канкрэтнага выпускніка і канкрэтнага заказчыка кадраў. Сама сістэма планавання падрыхтоўкі кадраў у краіне пабудавана на аснове заказу, каб максімальна выключаць сітуацыі, звязаныя з недахопам заявак на выпускнікоў у момант заканчэння навучальнай установы.

Аднак узнікаюць моманты, калі кампаніі, якія заказваюць кадры, у асобных выпадках перастаюць існаваць, змяняюцца іх кадравыя патрэбы, эканамічныя ўмовы дзейнасці... У гэтым выпадку камісіі маюць права і магчымасць накіроўваць выпускнікоў у іншыя арганізацыі.

Маладыя людзі маюць пераважнае права быць размеркаванымі туды, дзе праходзілі вытворчыя і пераддыпломную практыкі. Нічога не перашкаджае ім яшчэ на стадыі навучання, на трэцім-чацвёртым курсе ва ўніверсітэце, разам з кафедрай актыўна паўдзельнічаць у выбары месца сваёй практыкі з прыцэлам на тое, каб потым працаўладкавацца да гэтага наймальніка. Калі выпускнік без працяглых сістэмных кантактаў з наймальнікам у выглядзе практыкі, выканання навуковых работ у працэсе навучання па замове гэтай арганізацыі прыносіць ад яе заяўку непасрэдна перад размеркаваннем, такі варыянт таксама магчымы. Але такія заяўкі задавальняюцца ўжо пасля заявак заказчыкаў кадраў і базавых арганізацый.

### У БДУІР — ПЕРСАНІФІКАВАНЫ ПАДЫХОД

**Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі Вадзім БОГУШ** паведаміў, што ў іх ВНУ практыка персанальных заявак вельмі добра развіта: «Мы таксама маем дагаворы з базавымі арганізацыямі, ад якіх выпускнік можа прынесці індывідуальную заяўку. Нам тады зразумела, што наймальнік правёў папярэдні адбор і хоча запрасіць да сябе менавіта гэтага выпускніка. Абавязковай умовай з'яўляецца адпаведнасць месца работы атрыманай спецыяльнасці і кваліфікацыі. Калі казаць пра персаніфікаваны падбор, а гэта дастаткова сучасная практыка, то ў нас больш за палову планавых заявак, якія мы адпрацоўваем з наймальнікамі, потым персаніфікуецца. Гэтыя заяўкі прыходзяць з прозвішчамі канкрэтных маладых спецыялістаў, якія ідуць на дыпломную практыку, пішуць дыпломную работу і затым уладкоўваюцца працаваць».

Калі казаць пра тое, куды размяркоўваюцца выпускнікі БДУІР, то гэта шырокі спектр прадпрыемстваў як дзяржаўнай, так і прыватнай формы ўласнасці. Больш за 20 % выпуску гэтага года размеркаваліся ў кампаніі — рэзідэнты ПВТ. А па асобных факультэтах і 30 %, і 40 % выпускнікоў працуе ў гэтай сферы.

«Акрамя таго, што мы маем месцы для працаўладкавання выпускнікоў, якія падлягаюць размеркаванню, ёсць і дадатковыя заяўкі, якія засталіся незадаволенымі. Сёлета, напрыклад, у нас такая сітуацыя па спецыяльнасці «медыцынская электроніка», — заўважыў Вадзім Богуш. — Традыцыйна вельмі запатрабаваныя спецыялісты ў сферы распрацоўкі сучасных інфармацыйных тэхналогій. Заяўкі, якія засталіся незадаволенымі, назапашваем, прапануем выпускнікам, якія навучаліся на платнай аснове. Размеркаванне ў нас стапрацэнтнае. У лічбах гэта больш за 1,3 тысячы выпускнікоў, якія ўжо цяпер ведаюць, дзе яны будуць працаваць. Усе нашы хлопцы і дзяўчаты, якія павінны быць працаўладкаваны ў парадку размеркавання, ужо забяспечаны першым рабочым месцам».

### ЧЭРГІ — ПА ВЫХАВАЛЬНІКАЎ

Па словах **рэктара БДПУ Аляксандра ЖУКА,** апошнія гады патрэба ў педагагічных кадрах вельмі высокая.

— Універсітэт сёлета выпускае 720 чалавек, якія падлягаюць размеркаванню. На жаль, мы можам задаволіць заяўкі, што паступілі, прыблізна на 40 %. На сёння мы маем звыш 1850 заявак, з іх больш за 1,5 тысячы — з устаноў адукацыі Мінскай вобласці і Мінска. З іншых рэгіёнаў да нас ужо паступіла каля 300 такіх заявак. Найбольш запатрабаваныя — выпускнікі факультэта дашкольнай адукацыі. Выпуск складзе 118 чалавек, а паступіла амаль 500 заявак. Гэта значыць, што мы зможам іх задаволіць толькі на чвэрць. Па настаўніках пачатковай адукацыі — на 50 %. Сёлета вельмі запатрабаваныя спецыялісты сацыяльнай сферы — сацыяльныя работнікі і сацыяльныя педагогі. І таксама мы толькі на чвэрць зможам задаволіць заяўкі.

Пры гэтым у нас каля 180 выпускнікоў — мэтавікі, якія паедуць па накіраваннях у тыя ўстановы, якія зрабілі на маладых спецыялістаў мэтавыя заяўкі чатыры гады таму.

### ПРАФЕСІЙНАЕ СТАНАЎЛЕННЕ

Выпадкаў, калі выпускнікі не з'яўляюцца на месцы размеркавання, у краіне няшмат.

— Па-першае, прычыны бываюць уважлівыя — гэта паступленне на больш высокі ўзровень адукацыі, напрыклад, у магістратуру, альбо выпускніка каледжа на ўзровень вышэйшай адукацыі першай ступені. Таксама ўважлівая прычына — служба ў арміі, пытанні, звязаныя з непрацаздольнасцю. Згодна з аналізам, гэта каля 7 % выпускнікоў, — падкрэсліў Сяргей Каспяровіч. — Калі мы гаворым пра тых, хто не прыбывае на першае рабочае месца без уважлівай прычыны, то лічбы зусім невялікія. Напрыклад, па звестках аб вяртанні сродкаў (рашэнні, прынятыя на ўзроўні ўстаноў адукацыі) у 2018 годзе гэта крыху больш за 130 чалавек. Блізкая лічба ў нас і па 2019 годзе. Тут звесткі яшчэ могуць змяніцца, таму што выпускнік, які не прыбыў, мае час, каб пакрыць сродкі: спачатку ў добраахвотным парадку, а калі неабходна — у судовым.

— На прыкладзе нашага ўніверсітэта магу сказаць, што за тры апошнія гады не прыступілі да работы пасля размеркавання ўсяго 15 выпускнікоў, — праінфармаваў рэктар БДПУ Аляксандр Жук. — З улікам таго, што мы за гэты час падрыхтавалі амаль 2,5 тысячы спецыялістаў, — гэта прыблізна 0,5 %. У нашым універсітэце пераважная колькасць выпускнікоў — дзяўчаты, і ў выпадку, калі выпускніца выходзіць замуж, збіраецца ехаць па месцы жыхарства мужа, але застаецца ў сістэме адукацыі педагогам, мы ідзём насустрач і такую магчымасць даём, калі ёсць заяўка з гэтага рэгіёна.

Другі аспект, які пацвярджае, што людзі свядома атрымліваюць прафесію, — паказчык замацавальнасці на рабочых месцах. Мы вядзём такі маніторынг штогод. Магу сказаць на прыкладзе Мінскай вобласці (маніторым усе 23 раёны): ад 80 да 100 працэнтаў выпускнікоў 2014, 2015, 2016 гадоў засталіся ў сістэме адукацыі і замацаваліся на тых месцах, куды былі размеркаваны. Гэта, вядома, вынік дзейнасці мясцовых органаў улады і ўпраўленняў адукацыі. Яны робяць усё, каб чалавек меў добрыя ўмовы для работы, вырашаюць праблемы з жыллём.

На думку ўдзельнікаў анлайн-канферэнцыі, калі глядзець на размеркаванне з боку самога выпускніка, то адпрацоўка дае магчымасць для прафесійнага станаўлення. За два—пяць гадоў можна стаць канкурэнтаздольным спецыялістам на рынку працы, атрымаць важныя прафесійныя кампетэнцыі. Механізм, звязаны з працаўладкаваннем, комплексны. Ён улічвае ўзаемаадносіны на рынку працы, інтарэсы і выпускнікоў, і наймальнікаў. І ў гэтым працэсе ўзровень сацыяльнай падтрымкі моладзі ў нашай краіне з'яўляецца прыярытэтам. Пры жаданні атрымаць накіраванне на работу можа і любы выпускнік, які навучаўся за ўласныя сродкі. У праекце новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі закладзена норма, якая вызначае, што выпускнік-платнік, які атрымаў накіраванне на работу, таксама будзе мець статус маладога спецыяліста, як і выпускнік бюджэтнай формы навучання.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Я САМА»

## Беларускі хочуць самі будаваць жыццё сваёй мары

**32-гадовая хатняя гаспадыня з Глыбокага кажа, што хоча стаць прадпрымальніцай, таму што ёй надакучыла залежаць ад мужа. 55-гадовая журналістка з Віцебскай вобласці адчувае сябе на парозе жыццёвых перамен з прычыны ўзросту і шукае, чым заняцца на пенсіі. Надзея, былая настаўніца французскай мовы, пераехала з мужам з Мінска на хутар, там яны стварылі сваю экагаспадарку і хочуць, каб яна акуплялася. «Я шмат што ўмею рабіць, праўда, яшчэ не ўмею гэта прадаваць», — кажа Надзея...**

Дзяржаўныя служачыя, інжынеры, настаўнікі, менеджары, фрылансеры і архітэктары, якія хочуць змяніць від дзейнасці, але пакуль яшчэ не ведаюць, куды пайсці, — усё гэта пра ўдзельніц бізнес-школы для жанчын «Я сама», якая прайшла ў Полацку ў канцы лютага. Яны ўсе вельмі розныя. Але ёсць і тое, што іх аб'ядноўвае, — гэта актыўнасць, ініцыятыва і жаданне змяніць сваё жыццё да лепшага.

Якія бар'еры сустракаюцца на іх шляху? Што перашкаджае заняцца бізнесам? Мужчыны, адказваючы на падобныя пытанні, часцей за ўсё гавораць пра тое, што ім не хапае фінансаў і ведаў, а вось жанчыны, як правіла, на першае месца ставяць няўпэўненасць у сабе, страх перамен, вялікую долю сямейных абавязкаў. Таму, калі мы хочам, каб прадпрымальніц у краіне стала больш, трэба працаваць з гэтымі страхамі, павышаць у нашых жанчын упэўненасць у сабе, лічыць **кіраўнік праекта «Малыя гарады» Марына КАЛІНОЎСКАЯ.**

«Хоць у нас і створаны роўныя ўмовы для мужчын і жанчын, але ў апошніх усё ж ёсць свае асаблівасці. Тое, як нас выхоўвалі, перакананні і стэрэатыпы, з якімі нас гадавалі, тое, да якіх сацыяльных роляў рыхтавалі, роўна як і недахоп прыкладаў паспяховага вядзення жанчынамі бізнесу, — усё гэта абмяжоўвае беларусак», — кажа яна.

* * *

Праект ПРААН «Малыя гарады» накіраваны на тое, каб падтрымаць людзей,




якія хочуць адкрыць сваю справу або маштабаваць яе, але пакуль не могуць вырашыцца на гэта.

У яго рамках з восені мінулага года праводзяцца бізнес-школы для жанчын, на якіх іх вучаць асновам маркетынгу, а таксама таму, як пачаць сваю справу, як праверыць рынак, на якім будучая прадпрымальніца збіраецца працаваць, як вызначыцца са сваімі ідэямі і мэтамі.

«З іншага боку, мы ўключылі ў праграму таксама і блок аб тым, як сумяшчаць сацыяльныя ролі прадпрымальніцы, жонкі і мамы, — расказвае Марына Каліноўская. — Як быць эфектыўным кіраўніком і пры гэтым заставацца чароўнай жанчынай... А яшчэ многія нашы жанчыны вырастаюць з перакананнямі, якіх яны часта не ўсведамляюць, але якія прыпыняюць іх, перашкаджаюць папрасіць павышэння зарплаты або пасады, не даюць пакінуць сваю часцяком малааплатную работу і пачаць сваю справу. Пра гэта важна гаварыць і важна працаваць са сваімі страхамі і ўстаноўкамі, што абмяжоўваюць нас».




* * *

Вырашыцца адкрыць свой бізнес нярэдка дапамагае вопыт іншых жанчын. Таму на кожнай бізнес-школе «Я сама» выступаюць дасведчаныя прадпрымальніцы, паспяховыя жанчыны, гатовыя падзяліцца сваім вопытам.

«Я зусім яшчэ свежая прадпрымальніца, — кажа **Алена, настаўніца англійскай мовы,** якая нядаўна стала займацца рэпетытарствам. — Прыклады тых, хто ўжо чагосьці дамогся, прайшоўшы праз цяжкасці, натхняюць і паказваюць, што многае можна пераадолець». Другая слухачка бізнес-школы «Я сама», у якой ужо ёсць свой бізнес (яна займаецца грузаперавозкамі) апавядае, што прыехала паўдзельнічаць у двухдзённым семінары, каб знайсці новыя ідэі і знаёмствы, таму што «энтузіязм часам знікае».

— У рамках гэтага праекта мы працуем ужо тры гады, маем стасункі з прадпрымальніцамі Віцебскай і Магілёўскай абласцей, — кажа кіраўнік праекта «Малыя гарады». — І ўжо бачым гісторыі поспеху. Бачым, як жанчыны не са сталіцы і не з багатых сем'яў у сваіх маленькіх гарадках сталі адкрываць уласныя бізнесы. Дзіцячы цэнтр у Чавусах, касметычны кабінет там жа, аграсядзіба ў Мсціславе... Гісторыі гэтых жанчын паказваюць, што ўсё гэта магчыма, і яны могуць натхніць іншых — тых, хто пакуль што знаходзіцца на ростанях і сумняваецца ў сабе...

**Святлана БУСЬКО, фота аўтара.**

Юбілейная пятая бізнес-школа для жанчын «Я сама» прайшла ў Полацку 22-23 лютага. Яна была арганізавана праектам ПРААН «Малыя гарады» сумесна з бізнес-школай ІПМ, Міністэрствам эканомікі Беларусі і пры фінансавай падтрымцы Расіі і кампаніі Visa. Да гэтага такія ж бізнес-школы праходзілі ў Мінску, Віцебску, Горках і Магілёве. Усяго ў мерапрыемствах узялі ўдзел 300 жанчын з усіх канцоў Беларусі.

# Падарунак сярод навучальнага года

**У дзяцей і настаўнікаў Калінкавіцкай сярэдняй школы № 1 сапраўднае свята. Зусім нядаўна яны атрымалі ў карыстанне новенькі, сучасны, вельмі прасторны і камфортны спартыўны комплекс.**


Святлана КАРПУНІНА.


Настаўнік фізічнай культуры і здароўя, педагог вышэйшай катэгорыі Васіль БАМБІЗА.

Цяпер старшакласнікі могуць займацца на трэнажорах, ёсць зала для гульнявых відаў спорту, асобная зала з трэнажорамі для дзяцей спецыяльнай медыцынскай групы і цэлы паверх для гульні ў настольны тэніс.

«Наша школа была адкрыта ў 1937 годзе, у цяперашні будынак пераехала ў 1998-м. З таго часу не мела ўласнага спартыўнага зала, — расказала карэспандэнтам «Звязды» **дырэктар навучальнай установы Святлана КАРПУНІНА.** — Будаўніцтва спартыўнага комплексу пачалося яшчэ ў 2006 годзе, але не было завершана праз недахоп сродкаў. Летась будаўніцтва аднавілі дзякуючы, галоўным чынам, кіраўніцтву «Гомельтранснафты Дружба», якое прапанавала, каб прадпрыемства выступіла галоўным спонсарам. Актыўна дапамагалі таксама Гомельскі аблвыканкам, Калінкавіцкі райвыканкам, дэпутат Палаты прадстаўнікоў ад нашай акругі Яўген Адаменка. Комплекс быў добудаваны хутка — за тры месяцы».

Калінкавіцкая сярэдняя школа № 1 — адна з самых вялікіх у раёне, тут навучаецца 951 вучань. Апошнія два дзесяцігоддзі ўрокі фізкультуры прыходзілася праводзіць альбо на вуліцы, альбо ў памяшканнях іншых школ, што дазваляла выконваць адукацыйную праграму, але, напрыклад, на добрым узроўні навучыцца гульнявым відам спорту ў такіх умовах было праблематычна.


Настаўнік фізічнай культуры і здароўя, педагог вышэйшай катэгорыі Таццяна ШЫЛА.


Выпускнік школы Павел БАГДАНОВІЧ — настаўнік фізічнай культуры і здароўя, педагог першай катэгорыі, займаецца з вучнямі 11 «А» класа Вячаславам КАНАШАМ і Іванам БЕГУНОМ.

«Цяпер шмат пытанняў знята, дзеці займаюцца з задавальненнем, мы для ўсіх класаў спачатку правялі экскурсію, бо комплекс вялікі — тры паверхі, яго плошча — каля 2,5 тысячы квадратных метраў», — расказала дырэктар школы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Таццяна ТКАЧОВА,**
*г. Калінкавічы,*
*Гомельская вобласць.*

Асоба

# ТАТА ВАМ НЕ МАМА,

## або Пачынаючы фермер, відэаблогер і шматдзетны бацька

**У Канстанціна Рачко шмат спецыяльнасцяў — медбрат, вадалаз-выратавальнік, кухар, рэзчык па дрэве, мэбельшчык. Але, бадай, галоўная яго прафесія — шматдзетны бацька. Канстанцін з жонкай выхоўваюць семярых сыноў.**



### Ні пугай, ні пернікам

— Самы старэйшы ў сям'і Эрнест, яму 17 гадоў, малодшаму Веніяміну споўніўся год. Эрнест вучыцца ў будаўнічым каледжы, але кажа, што гэта не яго. Ён гуманітарый, захапляецца гісторыяй, музыкай, — расказвае шчаслівы тата. — Глеб займаўся музыкай, але не захацеў працягваць, і мы яго не сталі прымушаць. Глеб на канікулах любіць праводзіць час у вёсцы. Дапамагае мне па гаспадарцы, корміць трусоў, любіць корпацца ў агародзе. У яго вельмі лёгкая рука. З'есць яблык, кіне ў зямлю семечка, з якога хутка вырастае дрэўца. Барыс іграе на балалайцы, робіць розныя вырабы, выразае спецыяльнай пластыкавай ручкай разнастайныя фігуркі. Леў — вельмі шустры, добра вучыцца ў школе, атрымлівае толькі дзявяткі і дзясяткі. Хочам уладкаваць яго ў тэатральны гурток або на спевы. Вельмі харызматычны і артыстычны хлопец. Навуму шэсць гадоў, сёлета пойдзе ў школу. Мяркуем яго аддаць у спорт: ладзіць сам з сабой спаборніцтвы, спартыўны і спрытны. Платону чатыры гады, наведвае садок. Ну а любімы занятак Веніяміна — піць матуліна малако і спаць.

— І як спраўляецеся з такой арміяй? — цікаўлюся ў свайго суразмоўніка.

— Цяжка, вядома. Але жонцы цяжэй, чым мне. Ды мы праваслаўная сям'я, імкнёмся выхоўваць сыноў у хрысціянскім духу, прывіваць маральныя нормы. Свет настолькі поўны спакус, што ўберагчы ад іх дзяцей складана.

— Ці даводзіцца чаргаваць між сабой пугу і пернік?

— Усякія метады спрабавалі, — смяецца Канстанцін. — А калі сур'ёзна, то шмат перачыталі спецыяльнай літаратуры, але далёка не ўсе метады, пра якія пішуць спецыялісты, псіхолагі, падыходзяць на практыцы. Залатая сярэдзіна — моцна балавацъ нельга, трымаць у строгасці — таксама.

Канстанцін згадвае свой падлеткавы ўзрост. Хлопец і вуха праколваў, і валасы фарбаваў, і прыходзіў дадому пад раніцу. Але маці на гэта рэагавала спакойна. Знаёмыя нават здзіўляліся, калі дапамагала яму завушніцу ў вуха засоўваць. Ды жанчына паступала мудра — адной забаронай нічога не даб'ешся, толькі аддаліш сына ад сябе. І сапраўды, прахадзіў сын з завушніцай месяц і адмовіўся ад ідэі, маўляў, ніякага кайфу!

— У чатырнаццаць гадоў я пачаў сам зарабляць грошы, прывык разлічваць на свае сілы. І мяне раздражняе, калі бацькі лічаць, што яны павінны забяспечыць дзяцей кватэрамі. Чаму яны ўскладваюць гэтыя абавязкі на сябе? Гэта справа дзяцей — купіць жыллё або здымаць. Мы часцяком хочам, каб нашы дзеці займаліся тым, чым займаемся самі, або, наадварот, навязваем свае меркаванні. У выніку атрымліваецца канфлікт пакаленняў. Ні ў якім выпадку не трэба гэтага рабіць. Галоўнае — зразумець, якія ў сына або дачкі здольнасці, і скарэктаваць іх. А дзеці самі зробяць выбар, будуць займацца тым, што ім цікава.

### Прыехаў за індыком, а купіў дом

Канстанцін даўно марыў жыць у вёсцы і займацца сельскай гаспадаркай. Нарэшце мара ажыццявілася. І дапамог гэтаму выпадак. Мужчына завітаў у вёску Ачыжа Чэрвеньскага раёна да сваяка, каб купіць у яго індыка. А заадно набыў тут дом на ўсе грошы, што меў, афарміў асабістую сялянскую гаспадарку, узяў гектар зямлі.



Дом можна было назваць жылым домам умоўна. Але гэтыя абставіны не спынілі няўрымслівага чалавека, энтузіяста і рамантыка. Наадварот, цяжкасці і праблемы дадалі задору. Давялося пачынаць практычна з нуля. З цягам часу ўдалося перакрыць дах, замяніць падлогу, правесці электрычнасць, а варыўню прыстасаваць пад хлевушок для хатняй жывёлы. Гаспадар набыў бензапілу, самаробны мініпрактар, дрэваапрацоўчы станок, на старэнькіх «Жыгулях» зрэзаў кузаў, каб вазіць розныя матэрыялы. У планах пачынаючага фермера шмат задум: адкрыць лесапільню, пабудаваць свінаферму, прымножыць гаспадарку. Але для гэтага неабходна спярша ўзвесці пабудовы, каб жывёле было камфортна. А з цягам часу Канстанцін марыць уладкаваць дзіцячую пляцоўку з альтанкамі (арэлі тут ужо стаяць) і стварыць нешта накшталт кантактнага заапарку. Канстанцін Рачко робіць усё сваімі рукамі, яму дапамагаюць сябры, сваякі. Імкнецца рухацца паступова, максімальна эканомна з улікам бюджэту.

Пакуль у двары Канстанціна не так шмат хатняй жывёлы: індыкі, куры, перапёлкі, трусы, в'етнамскія парсючкі, цацаркі. Сваіх гадаванцаў гаспадар імкнецца карміць натуральным кормам, з мінімальным дабаўленнем камбікорму. Магчыма, жыўнасць расце не так хутка і не такая вялікая, у выніку мяса і яек атрымліваецца менш, але затое прадукцыя экалагічна чыстая. А нядаўна фермер завёў пчол.

— Я сам вельмі люблю мёд, сям'я — таксама, — прызнаецца ён. — Калі пачынаў займацца пчалаводствам, веды былі вельмі павярхоўныя. Вывучаў тэматыку па інтэрнэце, унікаў ва ўсе нюансы справы. Зрэшты, як і ва ўсім астатнім. І паступова шляхам спроб і памылак прыходзіў да высновы, чым займацца выгадней, якую жывёлу трымаць.

У фермера ўжо з'явіліся пастаянныя пакупнікі, бо ведаюць, што яго прадукцыя натуральная, экалагічная. Канстанцін лічыць, што выгадней прадаваць вырашчанае сваімі рукамі ў розніцу — штучны тавар будзе каштаваць даражэй. Як кажуць, лепш менш, ды лепш.

Вядома, цягам часу, калі ў гаспадарцы ўсё ўсталюецца, мужчына перавязе сюды сям'ю, каб дзеці жылі на свежым паветры, харчаваліся натуральнай ежай. Жонка яго падтрымлівае.

### Век жыві, век вучыся

Канстанцін Рачко — асоба публічная, вядзе свой ютуб-канал «Тата вам не мама». Ён дзеліцца з чытачамі тым, якія змены адбываюцца ў ягонай гаспадарцы, куды расходуе грошы. Канстанцін прызнаны адным з найбольш перспектыўных відэаблогераў YouTube: ён трапіў у спіс пераможцаў міжнароднага конкурсу NextUp. Гэтая праграма працуе з 2011 года. За час яе існавання больш чым 500 аўтараў прайшлі навучальны курс у 14 краінах. У конкурсе бралі ўдзел усе ахвотныя з Расіі, Беларусі, Казахстана і Азербайджана з каналамі ад 10 да 100 тысяч падпісчыкаў. З 675 заявак эксперты выбралі 12 каналаў-пераможцаў. Сярод асноўных крытэрыяў — арыгінальнасць кантэнту, цэласнасць гісторыі.

— Я здзівіўся, калі мне патэлефанавалі з незнаёмага нумара і запрасілі на курсы ў Маскву. Паехалі з жонкай, якая мне дапамагае з ідэямі для відэа. З сабой узялі маленькага Веніяміна. У Ачыжы на гаспадарцы засталася мая маці, а цешча даглядала дзяцей у Мінску, дапамагаў ёй старэйшы сын. Дарогу і пражыванне аплаціў YouTube. Акрамя таго, выдзелілі сертыфікат на набыццё тэхнікі. Курсы далі шмат ведаў, інфармацыі, новыя падыходы да здымак, іншае бачанне навакольных.

— Цяпер вы даяце парады чытачам?

— Ды не, што вы, наадварот, яны мне падказваюць, як весці гаспадарку. У сваіх каментарыях. Пачытаеш — і відаць, што я нічога не ведаю, — кажа Канстанцін.

Фермер верыць, што ўсё ў яго атрымаецца. І гэта сапраўды так. У аптыміста, чалавека, які не можа сядзець на месцы, у няспынным пошуку, прагнага да ведаў і ўсяго новага, усё павінна быць добра.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-12

**Продавец ОАО «Витебскоблавтотранс», 210001, г. Витебск, ул. Комсомольская, 27/11, тел. (0212) 68-73-41**

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-74876, площадью 479,5 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Журжевская, 24, составные части и принадлежности: две пристройки, крыльцо, проезжая часть, пешеходная часть (участок 1, участок 2), назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, расположенное на зем. участке с кадастровым №240100000001006053, площадью 0,1864 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Журжевская, 24 с целевым назначением – земельный участок для содержания и обслуживания здания специализированного для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель. Переход права на зем. участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. **Нач. цена:** 52680,00 бел. руб., в т. ч. НДС. **Задаток**: 5 268,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения торгов: 17.04.2020 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов: с 17.03.2020 с 08.30 по 16.04.2020 до 17.30. Условия аукциона**: Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить затраты на проведение независимой оценки рыночной стоимости объекта недвижимого имущества в размере 427,75 руб. в т. ч. НДС, затраты на организацию и проведение аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи не позднее 15 рабочих дней с момента объявления итогов аукциона, оплатить стоимость объекта не позднее 10 рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 N 609. **Лица, желающие участвовать в аукционе**, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Ознакомиться с предметом торгов** можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (33) 3463401, 68-73-41. Осмотр объекта осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «БПХО»

**Лот № 1, состав:** 1. Ремонтно-строительный цех, инв. №110/С-86164, 2307,7 кв. м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В. 2. Здание склада РСЦ, инв. №110/С-102697, 200,1 кв. м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 13В/1. 3. Закрытый склад РСЦ, инв. №110/С-102693, 628,2 кв. м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В/2. 4. Автостоянка, инв. №110/С-102634, 2603 кв. м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 17. 5. Гараж на три автомашины, инв. №110/С-102636, 187,4 кв. м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 13Б/1. 6. Пост охраны № 8, инв. №110/С-102583, 3,9 кв. м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 13Б/2. 7. Благоустройство РСУ, инв. № 110/С-111836, 8818 кв. м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, благоустройство РСУ. 8. Трубопровод сетевой воды от ТКЗА до РСЦ, инв. №110/С-111717, 80,4 м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, трубопровод сетевой воды от ТКЗА до РСЦ. 9. Трубопровод хозпитьевой воды от ВК-22А до РСУ, инв. №110/С-111758, 179,4 м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, трубопровод хозпитьевой воды от ВК-22А до РСУ. 10. Участок канализационной сети от РСУ до КК-116, инв. №110/С-111721, 187,6 м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, участок канализационной сети от РСУ до КК-116. 11. Кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ-0,4 кВ ТП-ЦМЛМ до ЩО «Автостоянка», инв. №050009, 245,6 м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ-0,4 кВ ТП-ЦМЛМ до ЩО «Автостоянка». 12. Кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ ЦМЛМ до РУ «РСУ», инв. №050007, 122,5 м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, кабельная линия КЛ 0,4кВ от НЩ ЦМЛМ до РУ «РСУ». 13. Кабельная линия 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РП «Пилорама», инв. № 050008, 128 м. Адрес: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, кабельная линия 0,4 кВ от НЩ ЦМЛМ до РП «Пилорама».

Обременения: решение о снятии запрета на осуществление регистрационных действий в отношении капитальных строений (поз. 1–4) будет принято не позднее дня, следующего за днем поступления всех денежных средств вырученных от реализации недвижимого имущества на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь (письмо Министерства юстиции Республики Беларусь).

Начальная цена с НДС – 844 428,00 бел. руб. Задаток – 100 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %. Земельный участок площадью 1,8890 га с кадастровым номером 141000000006002693. Право аренды (по 22.08.2046). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Условия аукциона:** 1. Подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона по продаже Лота. 2. Условия оплаты приобретенного Лота согласовываются сторонами при заключении договора купли-продажи. 3. Возместить Продавцу затраты на подготовку Объекта к продаже в размере 2 058,51 бел. руб. с учетом НДС в течение 5 рабочих дней после подписания договора купли-продажи. 4. Оплатить Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,3 % от цены продажи Лота №1 в течение 3 банковских дней со дня проведения открытого аукциона по продаже Лота. 5. Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи, государственной регистрацией перехода прав на приобретенный объект, возлагаются на Покупателя

**Аукцион состоится 17.04.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by. Продавец: ОАО «БПХО», 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, д. 7, тел. 8 (0163) 477571. Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 17.04.2020. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 15.04.2020 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта – Шамкуть Нина Михайловна, тел. 8 (016) 364-05-19

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»!

Наблюдательный совет сообщает, что согласно решению наблюдательного совета (протокол заседания № 337 от 11.03.2020) в повестку дня (опубликованную в газете «Звязда» № 35 (29149) 21.02.2020 г.) годового общего собрания акционеров, созванного на 25 марта 2020 года, внесены изменения

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ**

1. О рассмотрении отчета генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности за 2019 год и основных направлениях деятельности Общества на 2020 год.
2. О рассмотрении отчета о работе наблюдательного совета Общества за 2019 год.
3. О рассмотрении заключения ревизионной комиссии Общества за 2019 год.
4. О рассмотрении аудиторского заключения, подготовленного по результатам проведения аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2019 год.
5. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества и распределение прибыли и убытков Общества за 2019 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
6. Об утверждении дивидендов за 2019 год.
7. Об утверждении направления распределения и использования чистой прибыли Общества на 2020 год.
8. Об избрании членов наблюдательного совета Общества.
9. Об избрании членов Ревизионной комиссии Общества.
10. Об определении размера вознаграждений и компенсации расходов членам наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
11. О внесении изменений в устав Общества.

Собрание пройдет 25 марта 2020 года в 14.30 по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова,16, актовый зал. С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться у председателя наблюдательного совета по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, с 5 марта по 25 марта 2020 г. (время работы с 8.30 до 17.30), либо 25 марта 2020 г. по месту проведения собрания, контактный телефон (8-0212) 67-45-66.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, – 5 марта 2020 года.

Регистрация участников собрания с 13.45 до 14.15 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

*Наблюдательный совет.*

УНП 300000398

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ УП «Могилевское отделение БелТПП»

**2 апреля 2020 в 14.00**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩИХ ОБЪЕКТОВ**

**Лот № 1: экскаватор шагающий ЭШ 11.75, заводской номер 5, инвентарный номер 00445584** (изготовитель ОАО «Уралмашзавод», г. Екатеринбург, вместимость ковша 11$м^3$, длинна стрелы 75 м, скорость подъема ковша 2,71 м/сек.).

**Начальная цена продажи снижена на 20 % и составляет с учетом НДС (20 %):**

12 597 792 бел. руб. 00 коп. (двенадцать миллионов пятьсот девяносто семь тысяч семьсот девяносто два белорусских рубля 00 копеек); задаток 1 259 779 бел.руб. 20 коп (один миллион двести пятьдесят девять тысяч семьсот семьдесят девять белорусских рублей 20 копеек;

**Лот № 2: сборка вала 4201.12.310.0, номенклатурный номер 2401124;**

**Начальная цена продажи снижена на 20 % и составляет с учетом НДС (20 %):** 331 584 бел. руб. 00 коп. (триста тридцать одна тысяча пятьсот восемьдесят четыре белорусских рубля 00 копеек); задаток 33158 бел. руб. 40 коп. (тридцать три тысячи сто пятьдесят восемь белорусских рублей 40 копеек);

**Лот № 3: сборка вала Ш ч. 4201.12.310.0, номенклатурный номер 2403108.**

**Начальная цена продажи снижена на 20 % и составляет с учетом НДС (20 %):** 204 672 бел. руб. 00 коп. (двести четыре тысячи шестьсот семьдесят два белорусских рубля 00 коп.); задаток 20467 бел. руб. 20 коп (двадцать тысяч четыреста шестьдесят семь белорусских рублей 00 копеек);

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудский с/с, 2 АБК в районе месторождения «Каменка», тел. для осмотра лотов +375297493848.

**Организатор торгов:** унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: www.mogilevcci.by.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, к. 208, УП «Могилевское отделение БелТПП».

Лот № 1, 2, 3 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведении торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых УП «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся в 2 апреля 2020 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104 УП «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 1 апреля 2020 до 12.00.

**Регистрация участников торгов 2 апреля 2020 с 13.30 до 14.00 по адресу: г г. Могилев, ул. Циолковского, к. 208, УП «Могилевское отделение БелТПП».**

Телефон для справок: (0222) 778042, +375 033 6276659 (МТС), +375 0296927492 (Velcom).

Дополнительная информация размещена на сайте организатора в разделе «торги» по адресу: **www.mogilevcci.by.**

Извещение о предыдущих торгах по объектам было размещено в газете «Звязда» от 17.01.2020 г.

*ООО «Центр Белинвентаризация»*
*г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1*

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельское ПО «Кристалл» – управляющая компания холдинга «КРИСТАЛЛ-ХОЛДИНГ», 8 (0232) 27 95 41

| № лота | Наименование объекта | Стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Изолированное помещение (неустановленного назначения) с инв. № 350/D-14269, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 157, площадью 1031,3 кв. м по начальной цене – 130 200,00 руб.<br>– Автоматическая система контроля и учета электроэнергии с инв. № 00435057 по начальной цене – 4 560,00 руб.;<br>– Кондиционер «DALKIN 09» с инв. № 00435081 по начальной цене – 768,00 руб.; – Кондиционер «DALKIN 09» с инв. № 00435082 по начальной цене – 768,00 руб.; – Кондиционер Tadilux TRM 07H с инв. № 00435083 по начальной цене - 456,00 руб.; – Кондиционер Tadilux TRM 07H с инв. № 00435084 по начальной цене – 456,00 руб.;<br>– Пункт распределительный инв. № 00435105 по начальной цене – 480,00 руб.; – Теплосчётчик «Комбиметр QII» с инв. № 00046236 по начальной цене – 336,00 руб.; – Электросчётчик с инв. № 00431720 по начальной цене – 444,00 руб.;<br>– Кабельные линии связи с пластмассовой оболочкой с инв. № 00003086 по начальной цене – 2 520,00 руб.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000002004900 площадью 0,0911 га (доля права аренды – 12/25) | **140 988,00** | **14 098,80** |
| 2 | – Изолированное помещение (блок цехов производства «ЗАИ») с инв. № 350/D-283638, площадью 6 370,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 331Г/1-2, по начальной цене – 649 200,00 руб.<br>– Изолированное помещение (производственное помещение) с инв. № 350/D-283640, площадью 2 945,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 331Г/1-3, по начальной цене – 300 000,00 руб.<br>– Изолированное помещение (КТП-4) с инв. № 350/D-283641, площадью 44,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 331Г/1-5, по начальной цене – 3 960,00 руб.<br>– Изолированное помещение (ТУ) с инв. № 350/D-283595, площадью 45,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 331Г/1-4, по начальной цене – 4 020,00 руб.<br>Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006605 площадью 1,4731 га.<br>– Кран-балка опорная 3,2т с компл.тел. инв. № 00434865, по начальной цене – 5 040,00 руб.<br>– Электрокранбалка подвесная 2т, 16,5 м инв. № 00424501, по начальной цене – 4 200,00 руб.<br>– Электрокранбалка подвесная 2т, 16,5 м инв. № 00424502, по начальной цене – 4 200,00 руб.<br>– Шкаф освещения ШОТ 9705-98-74 инв. № 00412702, по начальной цене – 25,20 руб.<br>– Шкаф распределительный СП 62-41-1900 инв. № 00413188, по начальной цене – 132,00 руб.<br>– Шкаф электрический распределительный СПУ 62-91 инв. № 00412699, по начальной цене – 3,60 руб.<br>– Шкаф электрический распределительный СПУ 62-91 инв. № 00413006, по начальной цене – 80,40 руб.<br>– Кран-балка подвесная инв. № 02042131, по начальной цене – 4 560,00 руб.<br>– Кран-балка опорная 2т, 6м инв. № 02423402, по начальной цене – 2 880,00 руб.<br>– Кран-балка подвесная г/п 2т, 18м инв. № 02424687, по начальной цене – 4 560,00 руб.<br>– Шкаф электрический распределительный СПУ 62-9-1 инв. № 02413025, по начальной цене – 168,00 руб.<br>– Щиток освещения инв. № 02412663, по начальной цене – 60,00 руб.<br>– Кран-мост 1 бал. с эл. талью 3,2т инв. № 00042115, по начальной цене – 5 640,00 руб.<br>– Кран-мост 1 бал. с эл. талью 3,2т инв. № 00042114, по начальной цене – 5 640,00 руб.<br>– Кран-штабелер ОП-1.0-4.8-9.1 инв. № 02423520, по начальной цене – 3 000,00 руб.<br>– Кран-балка опорная с эл. талью инв. № 00423457, по начальной цене – 4 080,00 руб.<br>– Трансформатор ТМ-3 инв. № 00412616, по начальной цене – 8 040,00 руб.<br>– Шкаф ШВН инв. № 00412625, по начальной цене – 5 640,00 руб.<br>– Шкаф ШВН инв. № 00412626, по начальной цене – 960,00 руб.<br>– Распределительный пункт ПР3912-463 инв. № 02412467, по начальной цене – 180,00 руб.<br>– Распределительный пункт ПР3912-463 инв. № 02412466, по начальной цене – 180,00 руб.<br>– Шкаф электрический распределительный СПУ 6291 инв. № 02413061, по начальной цене – 396,00 руб.<br>– Перегородка металлическая инв. № 00002134, по начальной цене – 32 040,00 руб.<br>– Перегородка металлическая инв. № 00002135, по начальной цене – 16 200,00 руб.<br>Обременение: электроснабжение объектов Продавца и субабонентов, запитанных от КТП-4.<br>Примечание: теплотрасса центрального отопления на производственной площадке по ул. Ильича, 331 – демонтирована, коммуникации и отопительные приборы внутри изолированных помещений в наличии | **1 065 085,20** | **106 508,52** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **по 26 марта 2020 г**. в рабочие дни с $9^{00}$ до $16^{00}$ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **27 марта 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266.<br>Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация».<br>Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 17.03.2020 г. |
| **Условия продажи** | Объекты продаются в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Изолированное помещение (неустановленного назначения) с инв. №350/D-14269, изолированное помещение (блок цехов производства «ЗАИ») с инв. №350/D-283638 и изолированное помещение (производственное помещение) с инв. №350/D-283640 находятся в залоге, есть разрешение на продажу. Заключить договор купли-продажи в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить стоимость объекта, сформированную на аукционе, в течение 30-ти календарных дней с момента подписания договора купли-продажи, **возможна рассрочка платежа по лоту № 1 и лоту № 2 сроком на 6 (шесть) месяцев**.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

75 Вялікая Перамога

# «ЗАБРАЦЬ КАНЯ. ПРЫЗНАЧЫЦЬ АДКАЗНАГА ЗА ЧАРГУ»

## Як і чым партызаны дапамагалі мясцоваму насельніцтву

**Агульнавядома, што ў перыяд нараджэння і станаўлення партызанскага руху ў тыле ворага асноўнай крыніцай паступлення зброі і боепрыпасаў станавілася для іх акупаваная тэрыторыя. Зброю збіралі на месцах баёў Чырвонай Арміі і захоплівалі ў праціўніка. Вялікую дапамогу партызанам у гэтым аказвала мясцовае насельніцтва. З пачатку вайны жыхары сельскіх вёсак збіралі зброю і рыштунак па палях, лясах, балотах, хавалі, а затым перадавалі партызанам.**

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ партызан харчаваннем, адзеннем, абуткам адбывалася таксама за кошт сялянскіх гаспадарак, якія знаходзіліся ў зоне дзеяння партызанскіх фарміраванняў. Мясцовае насельніцтва аказвала неацэнную дапамогу партызанам, забяспечваючы іх звесткамі аб ахове ваенных аб'ектаў ворага, чыгунак і праходжання па іх эшалонаў. Многія жыхары вёсак з'яўляліся праваднікамі, самі ўдзельнічалі ў чыгуначных дыверсіях. Тысячы савецкіх людзей з уласнай ініцыятывы і па заданні партызан выконвалі не менш небяспечную работу сувязных. На працягу ўсяго перыяду партызанскай барацьбы мясцовае насельніцтва стварала ўсе ўмовы для існавання і баявой дзейнасці вялізнай арміі народных мсціўцаў.

Значна менш вядома пра зваротную сувязь — менавіта пра канкрэтную дапамогу партызан насельніцтву вёсак. І ўсё ж такія звесткі ёсць.

У пачатку красавіка 1944 года ЦК КП(б)Б накіраваў дырэктыву падпольным партыйным органам аб правядзенні вясенняй сяўбы ў тыле ворага і аказанні дапамогі мясцоваму насельніцтву з боку партызан. Раённыя камітэты партыі, у сваю чаргу, разаслалі ўказанні камандаванню партызанскіх брыгад. Чэрвеньскі падпольны райкам, напрыклад, у мэтах аказання практычнай дапамогі насельніцтву ў правядзенні сяўбы замацаваў за партызанскімі брыгадамі населеныя пункты раёна. Так, за партызанскай брыгадай «Разгром» замацоўвалася 50 вёсак, за брыгадай «За Советскую Белоруссию» — 35, за брыгадай імя Шчорса — 59 населеных пунктаў.

Партызаны лічылі сваім абавязкам аддзячыць сялянам за іх штодзённую дапамогу, таму ахвотна адгукнуліся і на справе пачалі дапамагаць сельскім жыхарам. У атрадных майстэрнях рамантаваўся сельгасінвентар, адкрываліся кузні, выдзяляліся коні і асабовы склад для ўзорвання зямель.

ВАРТА адзначыць, што партызаны з уласнай ініцыятывы бралі актыўны ўдзел у пасяўных кампаніях яшчэ ў 1942 і 1943 гадах. Так, у красавіку 1943-га камандаваннем партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага былой Баранавіцкай вобласці ў сялянскія гаспадаркі было накіравана 6 коней і 10 пудоў збожжа. Дванаццаці партызанскім сем'ям было выдадзена 26 пудоў бульбы. Напярэдадні пасяўной кампаніі 1944 года атрадам імя Каліноўскага вышэйназванай брыгады былі размеркаваны коні для апрацоўкі ўчасткаў у вёсках Зубовічы, Дзевергі, Янцавічы, Замошша, устаноўлена чарговасць, аказана дапамога партызанскім сем'ям насеннем: сям'і партызана Казерскага было выдадзена два пуды ячменю, партызана Матусевіча — чатыры пуды бульбы і пуд ячменю і г. д.

2 мая 1944 года Бярозаўскі падпольны райкам КП(б)Б накіраваў камандзірам партызанскіх брыгад дырэктыву з патрабаваннем прыняць усе меры для правядзення пасяўных работ у сялянскіх гаспадарках раёна, «каб як мага больш засеяць збожжа і бульбы не толькі на ўчастках сялян, але і на палях былых калгасаў». Адначасова камандаванню даручалася аказваць сялянскім гаспадаркам дапамогу насеннем, цяглавай сілай, накіроўваць у вёскі па магчымасці байцоў атрадаў і выстаўляць заслоны для аховы сялян, якія працуюць у полі.

Успамінаючы пра гаспадарчае жыццё ў Клічаўскай партызанскай зоне, былы камандзір 752-га партызанскага атрада Герой Савецкага Саюза Віктар Лівенцаў пісаў у сваёй кнізе «Партызанскі край»: «Праязджаючы па раёне, можна было пабачыць аратых, якія ішлі за плугам, а за плячыма ў іх віселі вінтоўкі, за поясам тырчалі гранаты».

НЕ менш сур'ёзна рашалася пытанне ўборкі ўраджаю. Неабходна было не проста хутка ўбраць ураджай, але і надзейна схаваць, каб ён не дастаўся праціўніку.

Начальнік штаба Палескага злучэння партызан Г. М. Дарошка восенню 1943 года накіраваў загад камандзіру 132-га партызанскага атрада Рыгору Краўцу аб неабходнасці прыняць экстранныя меры, каб не дапусціць вываз акупантамі ўраджаю з вёсак Сялюцічы, Грабаў, Мяходавічы, Бобрык і іншых Петрыкаўскага раёна, дзе праціўнік канцэнтраваў сілы і транспарт для захопу ўраджаю. Камандзіру атрада прадпісвалася ўсім асабовым складам аказаць дапамогу насельніцтву ва ўборцы ўраджаю, перакапаць насельніцтва і адправіць зжатае жыта і ячмень у лес.

У вёсках Забудзькі і Дойнічаў Бабруйскага раёна паліцаі спрабавалі забраць сабраны ўраджай і вывезці ў свой гарнізон. Даведаўшыся пра гэта, два партызанскія атрады 161-й брыгады імя Катоўскага загадзя занялі выгадную пазіцыю, сустрэлі рабаўнікоў агнём з аўтаматаў і кулямётаў і вымусілі іх уцякаць. Як напісаў пра гэта ў дакладной запісцы камандзір брыгады Андрэй Шашура: «Замест хлеба атрымалі немцы кулі».

Падобныя аперацыі праводзілі партызаны і з мэтай захавання сялянскай жывёлы.

Яшчэ ў красавіку 1942 года буйны атрад гітлераўцаў уварваўся ў вёску Стражы Старадарожскага раёна, дзе забраў 80 галоў жывёлы і абрабаваў насельніцтва. Партызанскі атрад імя Чапаева пад камандаваннем Георгія Сталярова арганізаваў на шляху вяртання рабаўнікоў засаду і раптоўным ударам адбіў усю скаціну і нарабаваную маёмасць, якая была вернута жыхарам вёскі.

28 лістапада 1942 года партызанскі атрад імя Фрунзэ, які дзейнічаў у Слуцкім раёне, правёў аперацыю па разгроме нямецкага гарнізона ў вёсцы Вясея. Падчас бою, якім кіраваў камісар атрада Кузьма Прыгуноў, партызаны захапілі 40 кароў і шмат іншых харчовых тавараў, тым самым забяспечылі сябе прадуктамі харчавання на працяглы перыяд і аказалі дапамогу сялянам і сем'ям партызан, раздаўшы ім 30 кароў.



Млын у партызанскім лагеры.

Партызаны 50-й Жыткавіцкай брыгады, ратуючы мірнае насельніцтва ад выгнання ў Германію, сялілі многія сем'і ў размяшчэнні брыгады, дапамагалі ім будаваць зямлянкі, забяспечвалі прадуктамі харчавання. Як паведамляў у данясенні штаба Палескага партызанскага злучэння камбрыг гэтай брыгады, «насельніцтву, якое ўратавалася ад фашыстаў, раздадзена 150 кароў, захопленых пры разгроме нямецкіх гарнізонаў, больш за 20 тон збожжа і іншых прадуктаў».

У лістападзе 1943 года камандзір атрада «Разгром» Уладзімір Чэрмянёў, даведаўшыся ад сваіх агентаў аб намеры акупантаў правесці аперацыю па адабранні жывёлы ў насельніцтва для адпраўкі ў Германію, своечасова папярэдзіў жыхароў вёсак Трубянок, Прыборы, Паддуб'е Смалявіцкага раёна і з дапамогай асабовага складу атрада арганізаваў выган скаціны з названых вёсак углыб лесу.



Карціна С. Раманава «Вясна ў партызанскай зоне».

НЕ заставаліся без увагі і асабістыя звароты і просьбы сялян да камандавання партызанскіх фарміраванняў. Так, у ліпені 1943 года на імя камандзіра партызанскага атрада «1 Мая» вышэйзгаданай 50-й Жыткавіцкай брыгады Уладзіміра Дзербана паступіла скарга ад селяніна пасёлка Посталы на аднавяскоўца В. Васілеўскага, які дагляdaў партызанскага каня і нікому яго не даваў для апрацоўкі зямлі, «а калі дае, дык патрабуе плату, тую, якой у людзей няма, а таму прашу вас забраць у яго каня і аддаць такім людзям, якія сапраўды будуць ставіцца да гэтага сумленна, па-грамадзянску». Камандзір распарадзіўся: «Забраць каня. Прызначыць адказнага за захаванне чарговасці».

Прадметам асаблівага клопату ў партызан былі дзеці. За гады вайны з партызанскіх аэрадромаў у савецкі тыл былі адпраўлены тысячы дзяцей, якія страцілі бацькоў. Толькі ў горадзе Ардатаў Мардоўскай АССР дзейнічалі тры дзіцячыя дамы, выхаванцамі якіх сталі беларускія дзеці.

Дзеля захавання мірнага насельніцтва ў многіх партызанскіх атрадах ствараліся сямейныя лагеры. Толькі ў адной брыгадзе імя Дзяржынскага Брэсцкай вобласці на 1 студзеня 1944 года дзейнічаў 21 сямейны лагер, які налічваў 426 сем'яў з колькасцю 1044 чалавекі, з іх дзяцей — 501 чалавек.

Камандаванне партызанскіх брыгад, партыйныя і камсамольскія арганізацыі адкрывалі пры сямейных лагерах школы, дзе праводзіліся заняткі з дзецьмі. У брыгадзе імя Свярдлова той жа Брэсцкай вобласці працавала шэсць школ, у якіх навучалася 310 дзяцей. У Акцябрскім раёне былой Палескай вобласці ў розны час дзейнічала восем школ. Настаўнікі падбіраліся ў партызанскіх атрадах, заняткі праводзіліся ў невялікіх прыстасаваных памяшканнях, а вясной і летам пры добрым надвор'і — пад соснамі.

Партызанскія ўрачы і сёстры ратавалі жыцці тысячам мясцовых жыхароў — параненым і хворым, маці і нованароджаным. У найцяжэйшых санітарных умовах, пры адсутнасці самых неабходных медыкаментаў, апаратуры і інструментаў праводзіліся хірургічныя аперацыі, аказвалася розная медыцынская дапамога. Напрыклад, распараджэннем камандавання партызанскага атрада імя Кірава, які дзейнічаў у Драгічынскім раёне, была абсталявана амбулаторыя для медыцынскага абслугоўвання сельскага насельніцтва. Медыцынскі персанал атрада штодзень прымаў да 35 чалавек.

У Расонскім раёне ўрачы брыгады імя Сталіна два разы на тыдзень спецыяльна выязджалі ў населеныя пункты для прыёму хворых, у асаблівых выпадках накіроўвалі іх у брыгадны шпіталь.

Своечасовай мерай па захаванні мірнага насельніцтва з'явіліся дзеянні камандавання Асіповіцкай ваенна-аператыўнай групы, якая прыняла рашэнне абясшкодзіць тэрыторыі вакол вёсак ад авіябомбаў, якія былі скінуты нямецкай авіяцыяй падчас карных экспедыцый супраць партызан і не разарваліся.

Неабходна памятаць і цаніць сапраўды высокі патрыятызм жыхароў вёсак, якія ў той час складалі большую частку насельніцтва нашай рэспублікі. Партызаны гэта адчувалі штодзень і таму, як маглі, стараліся абараніць сваіх карміліцаў ад акупантаў, аказаць ім дапамогу ва ўсіх гаспадарчых работах і ўмацаваць у іх душах веру ў перамогу над фашызмам.

**Генадзь БАРКУН,**
**гісторык.**

Шанаваць сваё

# РАДЗІМАЗНАЎСТВА І РАДЗІМАЛЮБСТВА

## І Рэспубліканскі краязнаўчы форум стаў квінтэсенцыяй гэтых паняццяў

**ЗВЫШ 230 удзельнікаў з усёй краіны — супрацоўнікі ўстаноў культуры, адукацыі і навукі, краязнаўцы-аматары, журналісты, пісьменнікі, навучэнцы школьных і студэнцкіх гурткоў, прадстаўнікі дзяржаўных ведамстваў і грамадскіх арганізацый. 220 работ — прэтэндэнты на ўзнагароды ў сямі намінацыях конкурсу краязнаўчых выданняў за 2017—2019 гады і маштабная выстаўка гісторыка-краязнаўчай літаратуры, у тым ліку з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У мінулую пятніцу ў сталіцы прайшоў І Рэспубліканскі краязнаўчы форум, зладжаны Нацыянальным гістарычным музеем і Беларускім фондам культуры пры падтрымцы міністэрстваў культуры, адукацыі і інфармацыі, Саюза пісьменнікаў і Выдавецкага дома «Звязда». Мерапрыемства, якое можна без перабольшанняў назваць доўгачаканым, стала новай, важнай і вельмі патрэбнай пляцоўкай для дыялогу аднадумцаў, абмену вопытам і ідэямі, абмеркавання праблем і перспектыў айчыннага краязнаўства — або, паводле трапнага вызначэння пісьменніка Анатоля Бутэвіча, ланцужка «краязнаўства, радзімазнаўства і радзімалюбства».**



### РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ

«Беларуская навука пастаянна сілкуецца з краязнаўчых крыніц. На працягу ўсёй гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук усе гуманітарныя даследаванні па гісторыі, культуры, фальклоры, этнаграфіі і многіх іншых аспектах, з якіх складаецца аблічча народа, грунтуюцца менавіта на краязнаўчых крыніцах, — падкрэсліў на адкрыцці форуму **дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр ЛАКОТКА.** — Усё гэта кладзецца ў скарбонку навуковага краязнаўства і працуе на росквіт і развіццё нашай дзяржавы».

За апошнія сто гадоў у краязнаўчым кірунку ў Беларусі было зроблена нямала. Так, ужо да пачатку 1928 года ў Беларусі прайшло два ўсебеларускія з'езды краязнаўцаў і дзейнічала больш за 300 краязнаўчых арганізацый, працаваў шэраг краязнаўчых музеяў. Старшыня ГА «Беларускі фонд культуры» Тадэвуш Стружэцкі прыгадаў іншыя знакавыя падзеі і факты: у 1965 годзе было створана Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, актывісты якога пры падтрымцы мясцовых органаў улады адкрылі каля 800 народных мемарыяльных музеяў і пакояў; у другой палове 1980-х з ініцыятывы Ніла Гілевіча было заснавана Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны; у гэты ж час НАН Беларусі падрыхтавала і выдала шэраг краязнаўчых энцыклапедычных выданняў; на працягу 1985—2005 гадоў быў паспяхова рэалізаваны, напэўна, самы маштабны дзяржаўны і грамадскі краязнаўчы праект — выйшла ў свет 146-томная гістарычна-дакументальная хроніка «Памяць»; у 1998 годзе была арганізавана ўсебеларуская турыстычна-краязнаўчая экспедыцыя «Наш край»...

Вельмі важна, што досвед і традыцыі папярэднікаў актыўна працягваюць сённяшнія даследчыкі, руплiўцы краязнаўчага руху з усіх рэгіёнаў. Напрыклад, дзякуючы працы вілейскіх краязнаўцаў на чале з Анатолем Рогачам у раёне з'явілася каля двух дзясяткаў памятных знакаў і мемарыяльных дошак, была ўшанаваная памяць зніклых вёсак (а іх на Вілейшчыне за апошнія паўстагоддзя стала ажно 253); Валянціна Логвін склала мясцовую энцыклапедыю былых вёсак Асіповіцкага раёна «Не знікай, мая вёсачка»; Таццяна Канапацкая з Лунінца выдала сем краязнаўчых кніг серыі «Лунінецкая памяць» — змястоўных і цікавых дадаткаў да раённай энцыклапедыі «Памяць», а Аркадзь Падліпскі з Віцебска — 10 кніг серыі «Біяграфія віцебскага дома» пра цікавыя будынкі і памятныя адрасы роднага горада. І гэты пералік апантаных людзей і здзейсненых імі спраў можна працягваць вельмі доўга.



Зрэшты, у тым і адметнасць рэспубліканскага краязнаўчага форуму, што прамовы тут гаварылі не пабочныя назіральнікі, а самі актывісты, практыкі краязнаўчага руху. Згадвалі пра выбітных асоб малой радзімы — ад славутага акадэміка Яўхіма Карскага да самабытнай мастачкі Ніны Бохан, рэдактара газеты «Беларуская справа» Алеся Вільчыцкага, кіраўніка слуцкіх млыноў у гады НЭПа купца Гутцайта, першага глыбоцкага краязнаўца Генрыка Віньчу і многіх іншых. Рабілі акцэнты на асобных эпізодах гісторыі і расказвалі пра маштабныя праекты, якія ўдалося рэалізаваць. Дзяліліся напрацоўкамі ў вывучэнні матэрыяльных і нематэрыяльных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны: сядзібных комплексаў, паркаў, крыніц і рэк, пагоркаў, родных вёсак, асобных плошчаў і вуліц, а таксама старажытнай батлейкі і сучаснага стрыт-арту, разьбярства па дрэве, ільнаводства, ткацтва, пчалярства, ганчарнага майстэрства і нават пернікавага промыслу. Выходзячы за межы гісторыі і этнаграфіі, закраналі пытанні экалогіі, геаграфіі, літаратуры, развіцця турыстычнага патэнцыялу рэгіёнаў, патрыятычнага выхавання, рэканструкцыі традыцый праз творчасць... Словам, разнастайнасць інтарэсаў удзельнікаў форуму прымусіла пашкадаваць толькі пра адно: што нельга раздзяліцца на мноства частак, пабываць адначасова на чатырох секцыях і школьнай канферэнцыі ды асабіста паслухаць усе даклады, абмеркаванні і дыскусіі.

### МЫ З БУДУЧЫНІ

Кажуць, усякая справа жывая, калі яна цікавая дзецям і моладзі. Яскравы доказ гэтага мы ўбачылі і на форуме. Па-першае, на секцыі «Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі», дзе педагогі дзяліліся канкрэтным досведам, як зацікавіць школьнікаў і студэнтаў гісторыяй і геаграфіяй, культурай і традыцыямі малой радзімы (тут, як паказвае практыка, спрацоўваюць самыя розныя спосабы: музейныя заняткі і ўдзел у рэканструкцыі матэрыяльных ды нематэрыяльных аб'ектаў спадчыны, пошукавыя экспедыцыі і сумеснае складанне летапісу сваёй вёскі ці горада, распрацоўка інтэрнэт-праектаў і квэстаў, творчыя конкурсы, у тым ліку з удзелам бацькоў, і шмат іншых захадаў, якія прыдумляюць і рэалізуюць настаўнікі). А па-другое, наўпрост у музейных калідорах.

Менавіта тут мы пазнаёміліся, бадай, з самым юным удзельнікам краязнаўчага форуму — Мацвеем Макарэвічам, які вучыцца ў чацвёртым класе сярэдняй школы № 3 Стоўбцаў. На форум ён прывёз даследаванне пра векавыя дрэвы Стаўбцоўшчыны, тэму якога падказала яму маці — настаўніца пачатковых класаў Таццяна Вацлаваўна. Хлопчык з захапленнем успамінае, як мама прапанавала дазнацца, колькі ж гадоў старому дубу і парку ў пасёлку Школьны, дзе захаваліся рэшткі былой сядзібы шляхецкага роду Ленскіх; як прыязджалі навукоўцы з Акадэміі навук, абмяралі дрэвы, бралі ўзоры керну і назвалі прыблізны ўзрост парку — 135 гадоў. «А дубу, па нашых разліках, яшчэ больш — 170 гадоў, але дакладна сказаць нельга, бо ўнутры дрэва вялізнае дупло вышынёй 3 метры і шырынёй каля 1,5 метра. Цяпер у нас мэта — каб гэтыя дрэвы набылі статус помнікаў прыроды мясцовага значэння», — расказвае Таццяна Макарэвіч. А Мацвей за некалькі хвілін паспявае пераказаць нам гісторыю касцёла ў Школьным і пахваліцца здымкамі з тэлефона, дзе відаць, як стары дуб ледзьве адбымаюць пяць чалавек...

Студэнты Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ўразілі сучасным падыходам да вывучэння спадчыны. Хіба магло гадоў дваццаць таму каму-небудзь з краязнаўцаў прыйсці ў галаву даследаваць гендарныя аспекты шкоднай магіі ў народнай культуры беларусаў Падзвіння? А Ірына Бондар правяла работу менавіта ў гэтым кірунку і выклікала на студэнцкай канферэнцыі «Моладзь і краязнаўства» шчырую зацікаўленасць. Наогул пяцёрка студэнтаў з полацкага гістфака распрацавала вельмі цікавыя і незвычайныя тэмы: Ганна Бабкова расказала пра дзікарослыя расліны ў купальскай абраднасці беларусаў Падзвіння, іх сімволіку і рытуальныя функцыі; Дзяніс Жукаў прааналізаваў вобраз чорта ў міфалагічных уяўленнях нашых сучаснікаў, Юрый Згірскі даследаваў «жыццё за Польшчай» па ўспамінах вясковага насельніцтва Докшыцкай гміны, а Настасся Цыганкова прадэманстравала, якім паспяховым можа быць вывучэнне каляндарнай абраднасці, калі за краязнаўчую справу творча і старанна бярэцца фальклорны гурт «Варган».

— Чаго мы чакаем ад форуму? — перапытвае за ўсіх Дзяніс Жукаў. — Паглядзець, што гэта наогул за пляцоўка, як яна працуе. Бо нам ёсць што сказаць, і калі гэта будзе актуальна, то выкажам свае меркаванні.

Заўважым: напрыканцы форуму ўсе работы «полацкага дэсанту» мадэратар студэнцкай канферэнцыі «Моладзь і краязнаўства» згадала як глыбокія і яркія. Спадзяёмся, розныя пакаленні даследчыкаў насамрэч пачулі і зацікавілі адно аднаго.

### ЧАС АБНАЎЛЯЦЬ «ПАМЯЦЬ»

Падводзячы вынікі конкурсу краязнаўчых выданняў за 2017—2019 гады, арганізатары стараліся не абысці ўвагай сапраўды вартыя работы, якіх аказалася вялікае мноства, — таму ў ліку пераможцаў і дыпламантаў у розных намінацыях некалькі дзясяткаў чалавек, а таксама ўстановы культуры, адукацыі, інфармацыі і навукі. Гран-пры і магчымасць выдання кнігі за кошт дзяржавы атрымаў Ігар Пракаповіч — вядомы на ўсю краіну ўраджэнец Пастаў, пісьменнік, географ, краязнавец і педагог, вынікам руплівай працы якога сталі ўжо 45 кніг краязнаўчай тэматыкі. І хоць асабіста пераможца віншаванняў не пачуў, паколькі знаходзіўся ў шпіталі, калегі і аднадумцы завочна віталі ягоны тытул шчырымі авацыямі.

Па выніках насычанай працы тэматычных секцый удзельнікі форуму вылучылі шэраг прапаноў на перспектыву. Адна з іх, якая паўтаралася найбольш часта, — неабходнасць перавыдання летапісу беларускіх гарадоў і раёнаў «Памяць». Матэрыялы для зборніка збіраліся яшчэ ў 90-я гады мінулага стагоддзя, і з таго часу мясцовыя краязнаўцы і навукоўцы назапасілі шмат новай інфармацыі. Таксама большасць краязнаўцаў пацвердзіла, што наспела неабходнасць стварыць рэспубліканскае краязнаўчае таварыства, якое аб'ядноўвала б усе ініцыятывы і аказвала метадычную дапамогу рэгіёнам. Гэтыя меркаванні, дарэчы, увайшлі ў выніковую рэзалюцыю форуму, таксама як ідэя выдання «Энцыклапедыі краязнаўцаў Беларусі» (яе ўжо ўхваліла выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі») і прапанова ладзіць рэспубліканскі форум не радзей чым раз на два гады і абавязкова запрашаць на яго не толькі айчынных даследчыкаў, але і дыяспары, беларусаў замежжа, многія з якіх вядуць актыўную краязнаўчую дзейнасць.

Сярод іншых гучалі просьбы да Міністэрства інфармацыі — пашырыць інфармацыйную падтрымку краязнаўства на ўсіх узроўнях, у прыватнасці, стварыць у раённых СМІ пастаянную рубрыку па краязнаўчай тэматыцы, да Міністэрства адукацыі — увесці на педагагічных спецыяльнасцях курс «методыка краязнаўства», каб будучыя настаўнікі ўжо мелі ўяўленне, як арганізаваць гэту работу на месцы. Але найбольш удзельнікі гаварылі пра важнасць такіх сустрэч. «Дзякуй за раскошу краязнаўчых стасункаў!» — эмацыянальна рэзюмавала агульныя ўражанні лаўрэатка конкурсу краязнаўчых выданняў Таццяна Канапацкая з Лунінца.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Што паглядзець



# АД НАЛЬШЧЫ ДА ЛОШЫЦЫ

**У музеі «Лошыцкая сядзіба» фінальным гарманічным акордам мастацка-літаратурнага пленэру «Нальшчанскія сустрэчы» прагучала выстаўка. Удзельнікі пленэру выяўленчымі сродкамі перадалі свае пачуцці і эмоцыі ад наведвання гістарычнай тэрыторыі, вядомай з летапісаў як княства Нальшчанскае.**

Прайшоў пленэр у маі мінулага года пры падтрымцы дабрачыннага фонду «Спадчына М. К. Агінскага» і аматараў культуры Францішка Жылкі і Алега Мізулы. Сярод аўтараў «Нальшчанскіх сустрэч» — заслужаныя дзеячы мастацтваў Беларусі Віктар Барабанцаў і Віктар Нямцоў, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Алесь Суша і вядомыя мастакі мінскага краю: Анатоль Бяляўскі, Віктар Мікіта, Галіна Бяганская, Кастусь Качан, Таццяна Ласка і Эдуард Мацюшонак. Па завяршэнні мерапрыемства асобныя работы былі выстаўлены ў Жодзішкаўскім касцёле Найсвяцейшай Тройцы. Пейзажы некаторых мастакоў засталіся на аграсядзібе Алега Мізулы «Вялес». Гаспадар «апрануў» іх у адмысловыя рамкі, уласнаручна выробленыя ў выглядзе скрыжаваных галін. У гэтым абрамленні карціны і прыбылі ў выставачную залу Лошыцкай сядзібы, уразіўшы знатакоў і аматараў мастацтва.



Прэзентацыя выстаўкі ператварылася ў яскравае свята з народнай музыкай, песнямі, выступленнямі паэтаў і бардаў. Ініцыятар падзеі і яе галоўны куратар маладзечанская мастачка Галіна Бяганская запэўніла, што праект будзе мець працяг, бо такія падарожжы творчых людзей па гістарычных мясцінах малой радзімы дораць натхненне і даюць станоўчы вынік як для творцаў, так і для прыхільнікаў выяўленчага мастацтва і літаратуры.

Выстаўка дзейнічае да 29 сакавіка. У яе межах пройдуць творчыя сустрэчы з паэтамі, удзельнікамі пленэру.

**Ала СТРАШЫНСКАЯ.**

Наш фармат

# БАТЛЕЙКА ДЛЯ РАМАНТЫКАЎ

**Гурт сярэднявечнай музыкі «Стары Ольса» падрыхтаваў абяцаную тэатральную прэм'еру — батлеечны спектакль у стылі Рэнесансу «Трыстан і Ізольда». Пастаноўка заснаваная на беларускай версіі вядомай гісторыі — «Аповесці пра Трышчана». Гэты літаратурны помнік, што ўяўляе сабой найбольш поўны і ўнікальны славянскі варыянт апрацоўкі славутай легенды, быў перакладзены на беларускую ў другой палове XVI стагоддзя з сербскай мовы і захаваўся да нашых дзён у Пазнанскім рукапісным зборніку.**



Фота staryolsa.com.

Работу музыкі пачалі яшчэ ў канцы 2018-га. Знайшлі адмысловую скрыню — ёй стала аздобленая элементамі ў стылі Віленскага барока старая шафа 1930-х, якую гурт набыў пад Бабруйскам. Сцэнарыстам і рэжысёрам спектакля выступіў лідар калектыву Зміцер Сасноўскі, над лялькамі працавалі майстры па гістарычных касцюмах Наталля Чарнышова і Аляксандра Шангіна, а дэкарацыі стваралі мастакі Яўгенія Валента, Вольга Верашчака і Арсеній Кацэла. Акцёрамі ж сталі самі ўдзельнікі «Старога Ольсы».

Адметнасць пастаноўкі — не толькі ў свецкім сюжэце, але перадусім у жывым музычным суправаджэнні на старадаўніх інструментах. Удзельнікі гурта выкарыстоўваюць максімальна дакладныя копіі, якія захоўваюць і дазваляюць адчуць гледачам дух эпохі. Сярод інструментаў — дуда, колавая ліра, гуслі, шалмеі, сурма, рэбек, лютня, цыстра, трамбамарына...

Спектакль і яго выканаўцы ўжо гатовыя да сустрэчы з публікай — прэм'ерныя паказы запланаваныя ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі падчас вясновых школьных канікул.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Сугучча

# НОВЫ АДРАС — ДУБРАЎКА

## Пухавіцкія сляды Лесі Украінкі

Сярод пухавіцкіх літаратурна-мастацкіх паселішчаў, тых вёсак, мястэчак, што звязаны з гісторыяй беларускай літаратуры, слаўнымі ўраджэнцамі Пухавіччыны, якія здзейсніліся як паэты, празаікі, большую вядомасць маюць Дукора, Рудзенск, Пухавічы, Шацк. А вось Дубраўка не на слыху ў гэтым плане. Але ж і тут адбываюцца дзеі, якія з часам стануць гісторыяй літаратурнага краязнаўства Пухавіцкага раёна.

Зусім нядаўна ў Дубраўскай сярэдняй школе прайшла імпрэза ў гонар украінскай пісьменніцы Лесі Украінкі. Да школьнікаў і настаўнікаў завіталі саветнік-пасланнік пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Пётр Урублеўскі і першы сакратар украінскага пасольства Іван Башняк. Вучні ў час мерапрыемства расказалі пра жыццёвы і творчы шлях Лесі Украінкі, прачыталі вершы класіка ўкраінскай паэзіі. Ансамбль «Мілавіца» выканаў беларускія песні.

Сустрэча ўсім прыйшлася даспадобы. Пра гэта гаварылі і ўкраінскія госці, і дырэктар школы Валянціна Андрэева, і дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея Аляксандр Прановіч. Дарэчы, у пухавічан даўняя дружба з украінскім пасольствам. Шосты раз пухавіцкія музейшчыкі ладзяць штогадовыя мерапрыемствы ў гонар Лесі Украінкі, якая наведвала некалі пухавіцкую вёску Блонь. У раённым музеі ёсць творы мастацтва, прысвечаныя класіку ўкраінскай паэзіі, а таксама выданні яе твораў. Неаднойчы вершы Лесі Украінкі гучалі ў сценах музея ў Блоні, у раённай мастацкай галерэі, якая знаходзіцца ў Мар'інай Горцы.

У беларускай сталіцы Мінску ёсць вуліца Лесі Украінкі. Мо з часам імя паэткі ўвойдзе і ў пухавіцкую тапаніміку? Чаму б не назваць імем Лесі Украінкі адну з вуліц Мар'інай Горкі, цэнтра Пухавіцкага раёна, альбо якую вуліцу ў вёсцы Блонь? Памяць засталася б на стагоддзі!..

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**

Пантэон Айчыны

# Ян Баршчэўскі (? — 1851)

**Ян Баршчэўскі пакінуў пасля сябе багатую спадчыну, але ў літаратуру ён увайшоў перадусім як аўтар захапляльнай і містычнай аповесці «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Безумоўна, калі б Баршчэўскі напісаў гэты твор па-беларуску, дык заслужыў бы славу вялікага беларускага пісьменніка і мог бы па праве лічыцца заснавальнікам новай нашай літаратуры.**

Своеасаблівы містычны талент Яна Баршчэўскага выхоўваўся на народных паданнях і павер'ях, паўпаганскіх уяўленнях беларускіх сялян, у атачэнні якіх рос шляхецкі хлапчук у родавым засценку Мурагі на беразе маляўнічага возера Нешчарда на Полаччыне. Філасофія «людскасці», разумення дабра і зла стане эстэтыкай яго твораў, якую ён данёс да вярхоў грамадства.

Падчас вучобы ў Полацкім езуіцкім калегіуме Ян пачаў пісаць вершы і атрымаў мянушку Вершапісец. Вядомасцю карысталася яго паэма «Пояс Венеры», у якой малады паэт наракаў на адсутнасць любові ў грамадстве — зразумелыя для такога ўзросту матывы. Некаторыя яго вершы рабіліся народнымі песнямі. Ды і сам Ян пісаў у стылі гэтых песень. Іх спявалі, а вось імя аўтара забывалася, а то і ўвогуле было невядомае. Гэтак здарылася з яго паэмай «Рабункі мужыкоў» (1812): яе лічылі народнай, фалькларысты запісалі твор яшчэ ў канцы XIX стагоддзя. Паэма падабалася народу сваёй антыпрыгонніцкай накіраванасцю і сатырай на п'янства. Мясцовы люд любіў свайго паэта. Ян марыў пра вялікі свет, дзе хацеў знайсці сваю «фартуну», і яшчэ не ведаў, што не адшукае там шчасця, душэўнага суладдзя і крыніцы натхнення.

З 1817 года Ян Баршчэўскі жыў у Пецярбургу. Дзяржаўная служба ў марскім ведамстве карміла, але не давала свабоды, і Баршчэўскі пакінуў яе, працаваў гувернёрам, адначасова выкладаў лацінскую і старажытнагрэчаскую мовы ў вучэльнях. А летам Ян з кіем у руках пешшу ішоў на радзіму. Тут ён адпачываў душой і натхняўся.

На літаратурнай ніве Ян Баршчэўскі доўга не меў прызнання, хоць сам вялікі Адам Міцкевіч чытаў яго вершы і нават рэдагаваў іх. Яго дакаралі, што ён падпарадкоўваецца рыфме, якая вядзе яго за сабой. Ян аспрэчваў гэтае меркаванне. «Прырода не дала мне моцнага духу філасофіі, мае думкі нараджаюцца з пачуцця», — казаў ён. Зрэшты, паслухаўшы парады сяброў і крытыкаў, Ян звярнуўся да прозы, і думка яго паляцела на Беларусь з яе таямнічымі паданнямі. «Я нарадзіўся там і вырас, іх скаргі і журботныя апавяданні, як гоман дзікіх лясоў, навявалі на мяне заўсёды змрочныя думкі і з дзяцінства былі маёй адзінай марай», — напіша ён. Паводле ўспамінаў пра радзіму Ян Баршчэўскі напісаў свой галоўны твор «Шляхціц Завальня».



Аповесць складаецца з паданняў і гісторый, якія апавядаюць Завальні яго госці ці падарожнікі. «Я люблю такія апавяданні. Шмат у гэтай народнай фантазіі Божае праўды», — вуснамі Завальні каза сам Ян Баршчэўскі. Перад чытачом паўстае маляўнічая галерэя народных постацяў — простых, чулівых людзей. Іх жыццёвая філасофія простая і зразумелая: «Хто працуе і просіць Бога, той і сам жыве заможна, і людзям дапамагае». А вось героі іх гісторый — хціўвыя людзі, якія за багацце прадаюць сябе розным злым духам і пачварам і трацяць сваю чалавечую існасць. Народная мараль (разуменне «людскасці») асуджае іх.

Вартасць аповесці Яна Баршчэўскага не толькі ў яе прытчавым характары, але і ў тым, што яна адкрыла шырокаму чытачу таямнічы край — Беларусь, яе старадаўнюю культуру. «Тое, што піша Баршчэўскі прозай, не датычыцца непасрэдна ні гісторыі, ні літаратуры, ні мовы Беларусі, але важнейшай рэчы — духу і паэзіі народа, адкуль выйшлі і гісторыя, і літаратура, і мова. Ён ухапіў найжыццёвейшыя асновы і вырашыў выявіць у мастацтве вялікі народны вобраз. Ён бачыць перад сабой народ, часта з усёй чароўнасцю паганскай фантазіі, якую ён апраменьвае сваім, так сказаць, беларускім гафманізмам», — вельмі трапна адзначыў характар аповесці крытык Рамуальд Падбярэзскі.

У кнізе выведзены і алегарычны вобраз Беларусі — гэта міфічная істота Плачка. У абліччы дзівосна прыгожай жанчыны яна аплаквае лёс роднага краю, яго слаўнае мінулае і забытыя святыні. Там, дзе забываюцца на мінулае, няма і будучыні. Вуснамі свайго героя Ян Баршчэўскі кажа пра прычыну заняпаду роднага краю: «Мы самі вінаваты, што д'яблы размножыліся ў нашым краі, прычына ўсяму — глупства шляхты, хцівасць і нязгода паноў».

Аповесць выйшла ў 1844—1846 гадах у Пецярбургу ў чатырох томіках. Польскаму чытачу яна была «чужая» праз яе відавочна беларускі характар, таму Ян Баршчэўскі «выпаў» з кантэксту польскай літаратуры. Да беларускага ж чытача «Шляхціц Завальня» прыйшоў даволі позна, таму складана ўсвядоміць яго значэнне для нашай культуры. Ян Баршчэўскі стаў закладнікам той культурнай сітуацыі, што склалася на землях былога Вялікага Княства Літоўскага: выкарыстанне польскай мовы як літаратурнай і ўсведамленне свайго адрознення ад карэннай польскасці, пошукі шляхоў вяртання да свайго, роднага, адвечнага. Вось Баршчэўскі і шукаў гэтыя шляхі, нават у назве аповесці пазначыў арыенцір — Беларусь.

Апошнія гады жыцця, з 1846 па 1851-ы, Ян Баршчэўскі жыве па запрашэнні графіні Юліі Ржавускай у яе маёнтку Чуднава на Валыні. Тут ён напісаў аповесць «Душа не ў сваім целе» і паэму «Жыццё сіраты». Містычныя матывы барацьбы зла і дабра, святла і цемры дапаўняюць роздум паэта пра жыццё народа, лёс чалавека і свой асабісты лёс, у якім ён знайшоў шчасце і спакой усё ж у творчасці, а не ў цярпенні «грозьбаў гэтага свету».

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

## ООО «Мебельное предприятие «Веста» извещает о проведении 30 марта 2020 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 10.00 по адресу: г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1

**Сведения о предмете торгов** (мебель, основные средства и материалы) и **начальной цене** предмете торгов размещены на сайте предприятия mpvesta.by.

**Место нахождения предмета торгов:** г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1.

**Продавец:** ООО «Мебельное предприятие «Веста», г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1.

Контактный тел. +375 29 177 99 94.

**Организатор торгов:** ликвидатор ООО «Мебельное предприятие «Веста» Шабловская Ольга Анатольевна, г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1, тел. +375 29 177 99 94.

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме. Продажа имущества производится без учета НДС. **Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток в размере 10 % от начальной цены лота на расчетный счет Продавца № р/с BY12 АКВВ 3012 0466 1677 8300 0000 в ф-ле 300 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21300, УНП 400560826.

**2.** Подать заявление продавцу по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Бабушкина, д. 1, в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. **Прием заявлений** для участия в аукционе **заканчивается 27 марта 2020 г. в 17.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.

**3.** В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

**Для участия в аукционе представляются**: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; ***юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*** – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о государственной регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством); ***юридическим лицом, иной организацией – нерезидентом Республики Беларусь*** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юридического лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; ***индивидуальным предпринимателем – резидентом Республики Беларусь*** – копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; ***индивидуальным предпринимателем – нерезидентом Республики Беларусь*** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; ***представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя – резидента Республики Беларусь*** – нотариально удостоверенная доверенность; ***представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента Республики Беларусь*** – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается безналичным платежом на счет в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней со дня проведения торгов; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец), в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С., извещает о проведении 27 марта 2020 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по ул. Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8** | | | |
| **2** | Обдирочно-шлифовальный станок, инв. № № 50380 | **260,00** | 26,00 |
| **3** | Обдирочно-шлифовальный станок, инв. № 50381 | **260,00** | 26,00 |
| **4** | Стенд для сборки двутавровых балок, инв. № 10038 | **11 950,00** | 1195,00 |
| **5** | Продольный сверлильно-фрезерный станок с ЧПУ и УАСИ, инв. № 61297 | **1 448 000,00** | 144 800,00 |
| **6** | Станок продольно-фрезерный 6М616 Ф 11.20.3, инв. № 60915 | **333 550,00** | 33 355,00 |
| **7** | Установка для грибовидности балок, инв. № 61421 | **8750,00** | 875,00 |
| **8** | Блок модуля (6,0*2.4*2.5), инв. № 61351 | **1450,00** | 145,00 |
| **9** | Станов для резки брусков, инв. № 605 | **165,00** | 16,50 |
| **10** | Алмазно-заточной станок 3М-642, инв. № 50075 | **2450,00** | 245,00 |
| **11** | Бесцентровочный станок 3А-184, инв. № 50071 | **2450,00** | 245,00 |
| **12** | Вертикально-фрезерный станок 6М13Л, инв. № 50050 | **1550,00** | 155,00 |
| **13** | Вертикально консольно-фрезерный станок мод FSS400MR-80, инв. № 60983 | **11 700,00** | 1170,00 |
| **14** | Заточной станок 3Д-642Е, инв. № 50061 | **900,00** | 90,00 |
| **15** | Зубострогальный станок 5А25ОП, инв. № 50053 | **3250,00** | 325,00 |
| **19** | Поперечно-строгальный станок 7М-37, инв. № 50056 | **800,00** | 80,00 |
| **20** | Профильно-шлифовальный станок 395М, инв. № 50015 | **2250,00** | 225,00 |
| **21** | Радиально-сверлильный станок 2М-55, инв. № 50076 | **2550,00** | 255,00 |
| **22** | Радиально-сверлильный станок 2М-55, инв. № 50059 | **2550,00** | 255,00 |
| **23** | Радиально-сверлильный станок 2Л53У, инв. № 50100 | **2300,00** | 230,00 |
| **24** | Станок горизонтально-расточной BFT-90/3, инв. № 60596 | **17 700,00** | 1770,00 |
| **25** | Станок заточной 3К-634, инв. № 50392 | **650,00** | 65,00 |
| **27** | Станок токарно-винторезный 1М63, инв. № 60627 | **4650,00** | 465,00 |
| **28** | Станок 1В340Ф30, инв. № 50378 | **4850,00** | 485,00 |
| **29** | Станок 1В340Ф30 инв. № 50374 | **3450,00** | 345,00 |
| **30** | Станок мод.1В310Ф30, инв. № 50368 | **4850,00** | 485,00 |
| **31** | Станок мод.1В310Ф30, инв. № 50365 | **4150,00** | 415,00 |
| **32** | Станок токарно-винторезный НВ340Ф30, инв. № 50390 | **3450,00** | 345,00 |
| **33** | Станок вертикально-фрезерный ВМ-127М, инв. № 50386 | **5850,00** | 585,00 |
| **34** | Станок горизонтально-расточной 2Н636Ф24, инв. № 50389 | **36 800,00** | 3680,00 |
| **35** | Станок ГПМ 16А20Ф3РМ-139, инв. № 50359 | **4 800,00** | 480,00 |
| **36** | Станок ГПМ 16А20Ф3С-139, инв. № 50354 | **3 450,00** | 345,00 |
| **39** | Станок модели 2Н-150 (вертикально-сверлильный), инв. № 50058 | **1 200,00** | 120,00 |
| **40** | Станок радиально-сверлильный ГС 545, инв. № 60978 | **10 250,00** | 1025,00 |
| **41** | Станок токарно-револьверный 1Е365БП, инв. № 50391 | **2750,00** | 275,00 |
| **44** | Станок токарно-винторезный 1К62 инв. № 50043 | **1400,00** | 140,00 |
| **47** | Станок токарно-револьверный 1П-365, инв. № 50084 | **2350,00** | 235,00 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210,Гомельская область, г. Жлобин, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 марта 2020 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25 марта 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

